Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

КРАСАВІК 14 1933 г. № 82 (4626)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ПРЫВІТАНЬНЕ ЦК УсеКП(б) ДЗЯМ'ЯНУ БЕДНАМУ

ЦК УсеКП(б) горача вітае пралетарскага пісьменьніка, паэта т. Дзям'яна Беднага ў дзень яго 50-годзьдзя.

Сваімі творамі т. Дзям'ян Бедны аказаў выдатныя паслугі рабочай клясе і працоўным сялянам у іх барацьбе супроць памешчыкаў і капіталістаў, у іх барацьбе за перамогу над імпэрыялістычнымі інтэрвэнтамі.

ЦК УсеКП(б) выказвае ўпэўненасьць, што выдатны літаратурны талент тав. Дзям'яна Беднага будзе і ў далейшым служыць вялікай справе камунізму.

ЦК УсеКП(б).

Аб узнагародзе т. Д. Беднага ордэнам Леніна

Пастанова прэзыдыуму ЦВК Саюзу ССР

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР пастанаўляе: «узнагародзіць ордэнам Леніна выдатнага пралетарскага пісьменьніка тав. Дзям'яна Беднага за яго літаратурныя заслугі перад рабочай клясай і працоўным сялянствам.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР КАЛІНІН.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР А. ЕНУКІДЗЭ.

ДАЦЬ КРАІНЕ 45.747 ТОН ПАПЕРЫ Ў 1933 г.

Множыцца лік пралетарскіх школ (ніжэйшых, сярэдніх і вышэйшых), лік жат чытачоў, клюбаў і іншых культурна-палітычных установаў Савецкай Беларусі. Павялічваецца з году ў год тыраж нашых газэт, часопісяў. Бязупынна ўзрастаюць патрабаваньні з боку працоўных мас да ўсё большага і розмаітайшага ліку друкаваных прац, ась вяпляючых розныя вучасткі сацыялістычнага будаўніцтва.

Прыгнечаная царызмам, некультурная, цёмная Беларусь—зараз, пры дыктатуры пралетарыяту зьяўляецца краінай сацыяльнай пісьменнасьці, краінай культурнага жыцьця.

Цяжка знайсьці ўжо зараз такую вёску, хату, куды-б не праслікла пралетарская газэта. А колькі ўжо разышлося выданьняў, тыражоў твораў класыкаў марксызму! Працы Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна стаі настольнымі кнігамі актыву нашай партыі. Гэтыя працы ўжо ня рэдкасьць і сярод шырокіх копаў рабочых, калгасьнікаў і ўсіх працоўных мас Савецкай Беларусі. ПАЛІТЫЧНЫ І КУЛЬТУРНЫ РОСТ НАШАЙ КРАІНЫ ВЯЛІКІ.

Папяровая прамысловасьць зьяўляецца такой галіной народнай гаспадаркі, якая зьклікана ў першую чаргу задавальняць сваёй прадукцыяй узрастаючыя народна-гаспадарчыя і культурна-палітычныя патрабаваньні нашай краіны. Каму невядома, што папера патрэбна для выпуску падручнікаў, тысячным калектывам вучняў Савецкай Беларусі. Каму невядома, што папера патрэбна для нашых газэт, часопісяў (тыражы якіх бязупынна растуць), для навуковай, тэхнічна і мастацкай літаратуры? Папера неабходна для плянамернага ходу работы прамысловасьці і іншых галін народнай гаспадаркі. На папяровую прамысловасьць усклядаецца адказнейшая задача ў справе задавальненьня гэтых патрэб. Між тым, папярэдні Савецкай Беларусі гэту сваю ганаровую задачу выконваюць яўна недавальняюча.

Папяровая прамысловасьць ідзе з прарывамі ў выкананьні сваіх плянаў на працягу доўгага часу. ТОЛЬКІ ЗА АДЗІН 1932 ГОД ПАПЯРОВЫМІ ФАБРЫКАМІ БССР НЕДАДАНА КРАІНЕ 30 З ЛІШНІМ ТЫСЯЧ ТОН ПАТРЭБНАЙ ПАПЕРЫ. План быў выкананы усяго на 48,3 проц.

Першы квартал першага году другой пяцігодкі ня даў колькі-небудзь прыметных зрухаў у працы папяровай прамысловасьці. План за гэты час па ўсёй прамысловасьці выкананы усяго на 60 ПРОЦ. КРАІНА НЕДААТРЫМАЛА 4,5 ТЫС. ТОН ПАПЕРЫ.

ВЯДУЧАЕ ПРАДПРЫЕМСТВА ПАПЯРОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ БССР — ФАБРЫКА «ГЕРОЙ ПРАЦЫ» (ДОБРУШ) ХВАРЭЕ ХРАНІЧНЫМІ ПРАРЫВАМІ. ПЛЯН 1932 ГОДУ ПА ГЭТАЙ ФАБРЫЦЫ БЫЎ ВЫКАНАН ТОЛЬКІ НА 48 ПРОЦ., А Ў ПЕРШЫМ КВАРТАЛЕ 1933 ГОДУ ВЫПРАЦАВАНА ЎСЯГО 57 ПРОЦ. ПЛЯНАВАГА ЗАДАНЬНЯ.

Партыя ня раз зварачала ўвагу на важнасьць папяровай прамысловасьці ў справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Па народна-гаспадарчым пляне 1933 году сума капітальных укладаньняў у беларускую папяровую прамысловасьць складае 2.550 тыс. руб. За гады пяцігод ні праведзена шырокая рэканструкцыя і пашырэньне фабрык папяровай прамысловасьці БССР. Створаны ўсе магчымасьці для нармальнай работы гэтай аднэй з важнейшых галін прамысловасьці на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва.

Але гэтыя аб'ектыўныя магчымасьці папяровай прамысловасьцю па-бальшавіцку не рэалізуюцца. У чым справа? Дзе мікробы гэтай хваробы?

ГАЛОЎНАЯ ПРЫЧЫНА ДРЭННАЙ РАБОТЫ ПАПЯРОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ Ў КОСНАСЬЦІ, НЕПАВАРОТ ЛІВАСЬЦІ ГАСПАДАРЧАГА КІРАЎНІЦТВА, У СЛАБАЙ РАБОЦЕ ПАРТЫЙНЫХ, ПРАФСАЮЗНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ПАПЯРОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ.

Хіба не абураючым фактам агідных адносін да сваіх абавязкаў зьяўляецца справа забесьпячэньня макулятурай — адным з гапоўных паўфабрыкатаў, які займае 50-55 проц. да ўсіх прывозных паўфабрыкатаў папяровай прамысловасьці? БЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ САЮЗПАПЕРСНАБУ, якое павінна непасрэдна займацца зборам макулятуры, адкрыла свае філіялы ў Менску, Віцебску, Гомелі, Магілеве, а глыбінныя пункты засталіся па-за ўвагай гэтай арганізацыі. Але і гэтыя філіялы, як і само аддзяленьне, займаюцца чым хочаш, толькі ня зборам макулятуры.

Неадкладнай задачай зьяўляецца арганізацыя ў папяровай прамысловасьці вырабу паўфабрыкатаў па мэтаду СУДАКОВА. Гэта дасьць магчымасьць у хутчэйшым часе забесьпечыць у значнай колькасьці папяровую прамысловасьць сваім упасным сырцем. На фабрыцы «СПАРТАК» з 1 красавіка 1933 г. ужо пушчана такая ўстаноўка па вырабу дрэўмасы. Ёсьць такія-ж магчымасьці і на фабрыках «ГЕРОЙ ПРАЦЫ», «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА». Для гэтага трэба, каб фанэрныя заводы аддавалі свае адкіды (шпоны) для гэтай дапаможнай вытворчасьці. Можна атрымліваць 10-15 тон папяровых паўфабрыкатаў у кожныя суткі.

Яшчэ горш справа стаіць з забесьпячэньнем фабрык папяровай прамысловасьці драўнінай і апалам. ЛЕСАСНАБЗБЫТ І УПАЎНАВАЖАНЫ НАРКАМЛЕСУ, якія павінны забесьпечваць фабрыкі гэтымі сродкамі, ВЕЗАД КАЗНА адносяцца да сваёй працы. Для фабрыкі «ГЕРОЙ ПРАЦЫ» (Добруш) гэтыя арганізацыі павінны даставіць 27 тыс. кбм. дроў. Ёсьць ужо і нарад на гэтыя дровы, але дастаўлена толькі 6 тыс. кбм. У выніку гэтага фабрыка, якая скарыстоўвае зьмешаны вілап (дровы і торф), спальвала толькі торф. У сакавіку фабрыка прымушана была закупляць торф за 50 кіпёмэтраў. У той час, як кошт аднай тоны торфу свайго торфазаводу («Шлях сацыялізму») з падачай на месца быў 25 руб., дык кошт тоны закупленага торфу вагаецца ў 40-45 руб. Фабрыка мае перарасходу 150 тыс. руб., а дровы знаходзяцца за 8 кіпёмэтраў ад фабрыкі.

Фабрыка імя Леніна таксама мае перабоі з-за адсутнасьці драўніны. Яна была прымушана скарыстоўваць у якасьці паўфабрыкату звычайныя дровы, з оучкамі. Зусім зразумела, якая можа быць у выніку такой работы якасьць прадукцыі і прадукцыйнасьць працы.

Ганебнае становішча фабрык папяровай прамысловасьці і з выкананьнем фінансавага пляну. Толькі па аднэй зарплаце запазычанасьць папяровай прамысловасьці на 1 красавіка 1933 г. складае 100.000 руб. Фабрыкі ня ў стане аплачваць рахункаў сваіх пастаў шчыкоў, якія ў сувязі з гэтым не адгружаюць ім сырцу. Драўнінная маса з ЛЕНІНГРАДУ для фабрыкі «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» не адгружаецца з-за непагашэньня рахунку. Атрымана зараз тэлеграма з Саюзснабзбыту аб неадгрузцы макулятуры фабрыкам «ГЕРОЙ ПРАЦЫ» і «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» за сыстэматычнае непагашэньне рахункаў.

АСНОЎНАЕ ЗЛО Ў КІРАЎНІЦТВЕ І РАБОЦЕ ПАПЯРОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ—ГЭТА НЯЎМЕНЬНЕ ПРАЦАВАЦЬ ПА-НОВАМУ, ПА-НОВАМУ КІРАВАЦЬ НА САМІХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ, НЯЎМЕНЬНЕ ПА-БАЛЬШАВІЦКУ АЎЛАДАЦЬ ТЭХНІКАЙ ВЫТВОРЧАСЬЦІ. Узяць, напрыклад, фабрыку «Герой працы». Яна рэканструявана па апошнім слове навукі і тэхнікі. Устаноўлена новая папяровая машына, пашырана сілавая гаспадарка. У мінулым годзе пушчан адзін з буйнейшых у Саюзе саломена-цэлюлёзны завод, які забясьпечвае фабрыку паўфабрыкатам. Пабудавана падвесная дарога ад торфазаводу, пабудаваны новыя карпусы. Дадаткова ўкладаецца ў 1933 г. на пашырэньне фабрыкі і далейшую рэканструкцыю 1.800 тыс. руб. Усе аб'ектыўныя магчымасьці на гэтай фабрыцы створаны. А між тым фабрыка ня выходзіць з палясы глыбокіх прарываў. Студзень 1933 г. даў выкананьне пляну: па паперы на 68 проц., па выпуску дрэўмасы на 63 проц., цэлюлёзы на 40 проц. Што, гэты плян нерэальны? Не. Ёсьць дні, і іх нямала, калі фабрыка дае 100 проц. выкананьне свайго сутачнага заданьня, а бывае і больш. Значыць, плян рэальны. АЛЕ НЯМА БАЛЬШАВІЦКАЙ ДОБРАСУМЛЕННАСЬЦІ З БОКУ АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАГА І ТЭХНІЧНАГА КІРАЎНІЦТВА ФАБРЫКІ. НЯМА ЎЛАСЬЦІВАЙ БАЛЬШАВІКОМ ГЕРАІЧНАЙ БАРАЦЬБЫ ЗА САЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ ВЫТВОРЧАСЬЦЬ. Частыя аварыі (нават новага абсталяваньня), прастоі ў выніку надбайных адно сін—звычайныя зьявішчы на фабрыцы.

Чым, як не бездакназнасьцю тэхнічнага кіраўніцтва на фабрыцы, можна вытлумачыць такія факты, калі 21 сакавіка была выведзена са строю трансмісія цэлюлёзнага заводу, калі 23 сакавіка на працягу 3 гадзін прастаяла дарагая турбіна «Борзінг».

Біч вытворчасьці — РАСХЛЯБАНАСЬЦЬ ПРАЦОЎНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ На тэй-жа фабрыцы «Герой працы» няма сапраўднай барацьбы з парушальнікамі працоўнай дысцыпліны. Звольненыя прагульшчыкі ГУТАРАЎ, ЧЫЖЭЎСКІ, ВАСІЛЬЛЕЎ, ГОЛУБЕЎ, ЖУРБЯНКОЎ і інш. зноў былі прыняты на фабрыку і працуюць на адказных вучастках яе. Прагульшчыкі і сымулянты НЭКРОДАЎ і СУДАРЫКАЎ, звольненыя з фабрыкі, зараз жывуць у фабрычных памяшканьнях, у той час як жыльлём не забясьпечаны ўдарнікі-рабочыя і ІТР. На фабрыцы «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА», як і на іншых, працоўная дысцыпліна не стаіць на належнай вышыні. Гэта гаворыць аб тым, што арганізацыі папяровай прамысловасьці праяўляюць блізарукасьць, распушчанасьць, бездакназнасьць у справе ўмацаваньня жалезнай пралетарскай працоўнай дысцыпліны на сацыялістычнай вытворчасьці. Фабрычныя партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі часамі праяўляюць самую няпрыкрытую палітычную блізарукасьць, якую кляса вы ворат скарыстоўвае ў сваіх мэтах. Справа даходзіць да таго, што некаторыя рабочыя, пад уплывам клясавага ворага кідаюць у начную зьмену варштаты і сьпяць у часе работы (фабрыка «Герой працы»).

Трэба, нарэшце, катэгарычна заявіць і самому ПАПЕРАБ'ЯДНАНЬНЮ АБ ТЫМ, ШТО ПРАЦАВАЦЬ ПА-НОВАМУ, ГЭТА ЗНАЧЫЦЬ СЫСТЭМАТЫЧНА, ШТОДЗЕННА, АПЭРАЦЫЙНА, НЕПАСРЭДНА КІРАВАЦЬ НІЗАВЫМІ ВЫТВОРЧЫМІ ЗЬВЕНЬНЯМІ. ПАПЕРАБ'ЯДНАНЬНЮ САПРАЎДЫ ТРЭБА ПАВЯРНУЦЦА БЛІЖЭЙ ТВАРАМ ДА ВЫТВОРЧАСЬЦІ, А ПАКУЛЬ ШТО ГЭТЫМ ЯНО НЕ ЗАЙМАЛАСЯ.

ЗА РАБОТУ ФАБРЫК ПАПЯРОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ НЯСУЦЬ ПОЎНУЮ АДКАЗНАСЬЦЬ МЯСЦОВЫЯ ПАРТЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ. ЧАШНІЦКІ, БАРЫСАЎСКІ І ПУХАВІЦКІ РАЕННЫЯ КАМІТЭТЫ ПАРТЫІ ЗУСІМ СЛАБА КІРУЮЦЬ ПАПЯРОВЫМІ ФАБРЫКАМІ.

Слабасьць работы фабрыкі «Герой працы» ў значнай ступені можа быць аднесена за кошт невыстарчальнай увагі Добруськага і Гомельскага раённых камітэтаў партыі.

Ад папярэдніх Беларусі патрабуецца рашучы пералом у рабоце. Магчымасьці для выкананьня пляну ёсьць. ТРЭБА ТОЛЬКІ ПА-БАЛЬШАВІЦКУ БІЦЦА ЗА КОЖНУЮ ТОНУ ПАПЕРЫ. РАСТАВІЦЬ СІЛЫ, ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ АВАНГАРДНУЮ РОЛЮ КАМУНІСТАЎ НА АДКАЗНЕЙШЫХ ВУЧАСТКАХ ВЫТВОРЧАСЬЦІ, МАБІЛІЗАВАЦЬ МАСЫ НА АЎЛАДАНЬНЕ ТЭХНІКАЙ ВЫТВОРЧАСЬЦІ, НА САЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ АРГАНІЗАЦЫЮ ПРАЦЫ НА АСНОВЕ В УМОУ ТАВ. СТАЛІНА, НА ЎМАЦАВАНЬНЕ ЖАЛЕЗНАЙ ПРАЛЕТАРСКАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ, НА БЯЗЛІТАСНУЮ БАРАЦЬБУ З КЛЯСАВЫМ ВОРАГАМ,—вось неадкладныя задачы мясцовых партыйных, прафсаюзных арганізацый.

Тады ганаровая задача—даць краіне ў 1933 годзе 45.747 тон паперы—будзе выканана.

АБВІНАВАЎЧАЕ ЗАКЛЮЧЭНЬНЕ ПА СПРАВЕ АБ ШКОДНІЦТВЕ НА ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯХ

(У СКАРОЧАНЫМ ВЫГЛЯДЗЕ)

СПРАВА АБ ШКОДНІЦТВЕ НА ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯХ СССР

МАСКВА, 13. Учора 12 красавіка, у кастрычніцкай залі Дому Саюзаў, роўна ў 12 гадзін дня, адкрылася судовае пасяджэньне асобага прысуцтва Вярхоўнага суда СССР, па справе аб шкодніцтве на электрастанцыях. Кастрычніцкая заля пераапоўнена. На пярэдніх мясцох — прадстаўнікі замежнай прэсы каля 50 чалавек і прадстаўнікі савецкага друку.

Месцы для дыплёматычнага корпусу ўсе запоўнены.

Справа слухаецца асобым прысуцтвам Вярхоўнага суда ў складзе: старшыні тав. **Ульрыха**, членаў т. т. **Мартэнса** і **Дзьмітрыева** і запаснога члена суда тав. **Зялікава**. Дзяржаўнымі абвінаваўцамі зьяўляюцца: вярхоўны пракурор РСФСР т. **Вышынскі** і нам. пракурора т. **Рагінскі**.

У якасьці абаронцаў прымаюць удзел па выбары падсудных члены маскоўскай калегіі абаронцаў: **Сьмірноў** для абароны падсуднага Макданальда, **Браўдэ**—Таритона, **Камодаў**—Манкагуза, **Лідаў**—Кушні, **Далматоўскі**—для абароны Грэгары і Гордвола, **Шварц**—Зорына, Крапюньнікова і Сухаручкіна, **Пінэс**—Лабанава, Лебедзева і Зівэрт, **Казначэў**—Гусева, Сокалава і Лейкіна, **Ліпсон**—Кутузавай і Катляроўскага.

У якасьці экспэртаў прымаюць удзел: інжынэр-цёплатэхнік **Браіла**, інжынэр-энэргетык **Галубцоў**, інжынэр-турбінішчык **Новікаў**, інжынэр тэхнолёг і электрык **Сьмірноў**, інжынэр-турбінішчык **Улатай**.

У 12 гадзін дня старшынствуючы тав. Ульрых абвяшчае судовае пасяджэньне асобага прысуцтва Вярхоўнага суда адкрытым. Сакратар суда тав. Касьцюшка зачытвае сьпіс прысутных падсудных. Адзін з падсудных Вітвіцкі, з прычыны хваробы, на прысутнічае на судзе.

Па просьбе пракуратуры і са згоды абароны справа аб ім выдзяляецца.

На пытаньні старшыні суда тав. Ульрыха кожны з падсудных заяўляе, што абвінавачанае заключэньне яны атрымалі своячасова і што адводаў супроць складу суда з боку абвінавачаных няма. Старшынствуючы задае пытаньне пракуратуры і абароне—ці няма з іх боку якіх-небудзь хадайніцтваў аб выкліку сьведак і г. д. Пракуратура і абарона заявілі, што ў іх такіх хадайніцтваў няма. Пасьля гэтага сакратар суда зачытвае абвінавачэнне заключэньне.

У афіцыяльным паведамленьні АДПУ, надрукаваным 14 сакавіка 1933 году ў «Известиях ЦИК и ВЦИК», было ўказана: «Праведзеным АДПУ расьсьледваньнем раду нечаканых аварый, якія пасьлядоўна паўтараліся і адбываліся за апошні час на буйнейшых электрастанцыях (Маскоўская, Чалябінская, Зуеўская, Златаустаўская), устаноўлена, што аварыі гэтыя зьяўляюцца рэзультатам шкодніцкай дзейнасьці групы злачынных элементаў з ліку дзяржаўных служачых у сыстэме Наркамату дзяржай прамысловасьці, паставіўшай сабе мэтай разбурэньне электрастанцый СССР (дывэрсыйная дзейнасьць) і вывад са строю дзяржаўных заводаў, якія абслугоўваюцца гэтымі станцыямі».

Расьсьледваньне паказала, як указ ваецца ў гэтым паведамленьні, што: «у дзейнасьці гэтай шкодніцкай групы прымалі актыўны ўдзел таксама некаторыя служачыя ангельскай фірмы «Мэтрапаліётан-Вікерс», працуючыя ў СССР на падставе дагавору з гэтай фірмай па тэхнічнай дапамозе прадпрыемствам электрапрамысловасьці СССР».

Далейшае расьсьледваньне ўстанавіла, што контр-рэвалюцыйная дзейнасьць шкодніцкай групы заключалася:

1) ў псаваньні абсталяваньня з мэтай падрыву магутнасьці савецкай прамысловасьці і аслабленьня савецкай дзяржавы;

2) зьбіраньні і выкарыстаньні на шкоду дзяржаве сакрэтных вестак ваенна-дзяржаўнага значэньня;

3) у хабарніцтве і подкупе асобных служачых дзяржаўных электрастанцый у сувязі з ажыцьцяўленьнем імі шкодніцкай контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці;

Экспэртная камісія, створаная пракуратурай РСФСР для праверкі і тэхнічнай ацэнкі ўсіх дакумантаў, якія ёсьць у справе, прыйшла да вываду аб наяўнасьці ва ўсіх абсьледаваных выпадках аварый або злачыннай неахайнасьці, або простага шкодніцтва.

I. Шкодніцкая і шпіёнская дзейнасьць на Златаустаўскай электрастанцыі

На Златаустаўскай электрастанцыі і Златаустаўскім металюргічным заводзе на працягу раду год і, у прыватнасьці, у перыяд 1931-33 гадоў быў рад аварый з маторамі, катламі, вугляпадачай і іншымі агрэгатамі.

У сувязі з аварыямі быў прыцягнут да адказнасьці начальнік Златаустаўскай электрастанцыі інжынэр **Гусеў**, які прызнаў сябе вінаватым у арганізацыі шкодніцкай групы на Златаустаўскай электрастанцыі і ў атрыманьні грошай за стварэньне аварый ад ангельскага інжынэра **Макданальда Вільяма**. Пачатак сваёй актыўнай контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці Гусеў адносіць пад канец 1929 году, калі на Златаустаўскую электрастанцыю прыехаў Макданальд, служачы ангельскай фірмы «Мэтрапаліётан-Вікерс».

«Пры аднэй з сустрэч у Макданальда на кватэры,—паказвае Гусеў,—ён, Макданальд, прапанаваў мне заняцца зьбіраньнем вестак аб рабоце Златаустаўскага заводу». Гусеў, даўшы згоду на шпіянаж, быў запэўнен Макданальдам, што яго злачынная дзейнасьць будзе аплачана. Прыцягнуты да адказнасьці па гэтай справе Макданальд пры першым-жа допыце прызнаў правільнасьць паказаньняў Гусева. «... Прыкладна месяцаў праз 8-9 пасьля майго прыезду ў Златаўст,—паказвае Макданальд,—я пачаў адкры та гаварыць з Гусевым. Я проста сказаў Гусеву, што мне патрэбны вестак аб ваенных вытворчасьцях златаустаўскіх заводаў, стане энэргаснабжэньня і г. д.». На запытаньне аб тым, па чым даручэньні ён атрымліваў ад Гусева весткі, Макданальд указаў на Таритона, які зьяўляецца галоўным мантажным інжынэрам фірмы «Мэтра-Вікерс».

Характар і аб'ём шпіёнскай дзейнасьці Гусева зьмяняўся ў адпаведнасьці з заданьнямі, якія атрымліваліся ад Макданальда. Гусеў заявіў: «Я яму (Макданальду) пачаў даваць весткі наступнага зьместу:

1) па пытаньнях энэргаснабжэньня златаустаўскіх заводаў і меркаванай рэканструкцыі электраснабжэньня. Гэта, нясумненна, было сакрэтна, бо давала ўяўленьне аб разьмерах ваенна-абарончай вытворчасьці;

2) па пытаньнях вытворчай праграмы знарадпай вытворчасьці, якія прадстаўлялі сабой чыста ваенныя тайны;

3) па пытаньнях аб тыпах знарадаў і пашырэньня знарадпай вытворчасьці, што таксама зьяўляецца ваеннай тайнай;

4) па пытаньнях вырабу высокаякасных сталяй, а ў асаблівасьці вырабу аўтарэсорнай і авіяцыйнай сталяй і знарадпай загатоўкі».

Сьледзтва прывяло да ўстанаўленьня, што зьвязаным з Макданальдам па шпіёнскай рабоце аказаўся памочнік начальніка электрастанцыі **Сокалаў**. Пасьля ад'езду Макданальда з Златаусту сувязі Гусева з Макданальдам, які пачаў працаваць на Зуеўцы, працягваліся. Макданальд атрымліваў ад Гусева сакрэтную інфармацыю праз **Рабаву** і яе сыноў. Гусеў асабіста прыязджаў у Зуеўку для паведамленьня аб шпіёнскай рабоце на златаустаўскіх заводах. Пры звароце Гусева з Зуеўкі ў Златаўст ён бачыўся на станцыі Харпіск з Таритонам, якому перадаў сакрэтныя весткі.

Асноўным зьместам контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці Гусева зьяўлялася паладжаньне аварый на Златаустаўскай электрастанцыі і затрыманьне работ па яе папярэдніі.

Паводле сьцьвярджэньняў Гусева, ён атрымаў ад Макданальда заданьне:

1. Скарачэньне выпуску знарадаў і халоднай зброі на механічным заводзе.

2. Скарачэньне выпуску высокаякаснай сталі на металюргічным заводзе.

Макданальд прызнаў правільнасьць гэтых паказаньняў.

Аб сваім удзеле ў ажыцьцяўленьні шкодніцкіх актаў Гусеў даў паказаньне, у якім гаворыцца, што па заданьні Макданальда на Златаустаўскім металюргічным заводзе былі праведзены наступныя шкодніцкія акты:

1. Выведзен са строю пяць ці шэсьць раз матор, які служыць для прыводу ў дзеяньне буйнага сартавога стану пракатнага цэху. У жніўні месяцы матор, з прычыны гэтых аварый, быў пастаўлен на перамотку на 20—25 дзён.

2. Замарожан кацёл № 8 на Златаустаўскай электрастанцыі.

3. Выведзена са строю вугляпадача ў канцы 1931 г. шляхам направільнай установкі матора і закладаньня невялікіх металічных прадметаў у цыліндрычную зубчатую перадачу.

4. Затрыман мантаж і пуск у эксплёатацыю катла № 11 з прычыны таго, што была адпраўлена ў мартэн пад відам негодных дэталяй арматура катла.

Запытаны Макданальд сказаў: «Я ўказаў Гусеву пасьля даволі цеснага зблізканьня з ім, што ў якасьці сродку барацьбы з савецкай уладай трэба скарыстаць такі сродак — арганізацыю аварый на вытворчасьці, прычым у найбольш важных яе пунктах».

У псаваньні матора прымаў удзел памочнік начальніка сілавой станцыі Сокалаў В. А.

Наступным шкодніцкім актам быў вывад з строю вугляпадачы па заданьні Макданальда. Макданальд пацьвердзіў, што такое ўказаньне ім сапраўды было дана Гусеву. Апрача таго, Макданальд на вочнай стаўцы з Гусевым пацьвердзіў, што ён даваў апошняму заданьне арганізаваць вывад са строю катлоў № № 1, 2, 8, 11. Заданьне было выканана.

Наконт гэтага Макданальд паказаў: «Я ставіў перад сабой задачу — непасрэднае расстройства электрасабесьпячэньня ўказаных заводаў, што павінна было скараціць работу ваеннай вытворчасьці».

Злачынная дзейнасьць шкодніцкай групы Златаўстаўскай электрастанцыі не абмяжоўвалася выводам са строю машын, але была накіравана і на падрыхтоўку дывэрсыйных актаў на выпадак вайны.

Гусеў на вочнай стаўцы з Макданальдам паказаў, што Макданальд абмяркоўваў з ім мерапрыемствы па выводу са строю абсталяваньня станцыі на выпадак вайны і даў простыя заданьні арганізоўваць аварыі пры абвяшчэньні вайны ў самых адказных пунктах станцыі.

Абвінавачаны Макданальд паказаў: «Сказанае Гусевым па гэтым пытаньні адпавядае тым указаньням, якія я яму даваў».

Контр-рэвалюцыйная, шкодніцкая і шпіёнская дзейнасьць Гусева і Сокалава аплачвалася Макданальдам. Гусеў заявіў, што ён атрымаў ад Макданальда ад 2-х да 3-х тысяч рублёў. Сокалаў таксама атрымліваў грошы. Таритон паказаў, што, па-першае, у тых мясцох, дзе Макданальд праводзіў мантажную работу, Макданальд сапраўды займаўся зьбіраньнем вестак для яго і па яго даручэньні, па-другое, што ён сапраўды атрымліваў ад Макданальда весткі па Златаустаўскім і Зуеўскім раёнах, па-трэцяе, Таритон ведаў, што Гусеў зьяўляецца асобай, прыцягнутай Макданальдам для зьбіраньня вестак аб рабоце Златаустаўскай электрастанцыі. Таритон пацьвердзіў пажаданьні Макданальда аб тым, што ён даваў яму грашовую суму для аплаты людзей, якія давалі шпіёнскую інфармацыю. Гусеў на вочнай стаўцы з Таритонам 15 сакавіка паказаў, што яго плян скарачэньня магутнасьці электрастанцыі на палову для таго, каб заводы ім маглі працаваць, Таритон ухваліў. «Прычым ён сказаў, — паказвае Гусеў, — што нам непакоіць аб тым, што гэты плян ня будзе сапраўдным, бо Чалябінск будзе перадаваць тое без перабояў, абгрунтоўны, што гэты факт не павінен нас турбаваць, бо Чалябінск знаходзіцца пад іх уплывам».

2. Шкодніцтва на Чалябінскай дзяржаўнай раённай электрастанцыі

Паводле паказаньня галоўнага інжынэра Чалябінскага Вітвіцкага, прыцягнутага ў якасьці абвінавачанага, была сур'ёзная аварыя ў канцы кастрычніка 1931 г. Вясной 1932 г. адбылася аварыя з топачным маторам катла з прычыны кароткага замыканьня. У сувязі з радам непаладак на апрэгаце № 1, у прыватнасьці, празьмерным направаньнем генэратара, станцыя паведаміла «Электраімпарт» аб неабходнасьці перамоткі лобавых частак генэратара. Для агляду гэтых непаладак у чэрвені 1931 г. на Чалябінск прыбыў гр-н Таритон. Агледзеўшы генэратар, Таритон сустакоў'ў адносна яго празьмернага направаньня. У гутарцы з Вітвіцкім Таритон указаў, што фірме трэба мець інфармацыю аб становішчы спраў на станцыі. «Я, відома, добра разумею, — гаворыць Сухаручкін, — якога роду і для якой іменна мэты патрабуецца фірме «Мэтрапаліётан Вікерс» весткі, аб якіх гаварыў Таритон. Я разумею, што Таритон — перадатачнае зьвяно да другіх асоб і арганізацый, якія займаюцца зьбіраньнем такіх вестак».

Таритон абяцаў, што перадача інфармацыі будзе добра аплачвацца. За свае шкодніцкія акты Вітвіцкі атрымаў у агульнай суме 6.900 руб. Лісты, якія перадаваліся Вітвіцкім Макданальду, зьмяшчалі пляны шкодніцтва на Чалябінскае, што намячаліся контр-рэвалюцыйнай групай, у прыватнасьці, вывядзеньне турбін со строю. Па паказаньні Вітвіцкага па дачы шкодніцкай групы на Чалябінскае заключаліся ў тым, каб затрымліваць разьвіцьцё станцыі і правадзіць эксплёатацыю яе так, каб якія ішла з перабоямі і аварыямі, што і было ажыцьцёўлена. Шкодніцкая група мела распрацаваную праграму дзеяньняў на выпадак вайны.

Выконваючы пасобныя дывэрсыйныя акты, контр-рэвалюцыйная група мела мэтай падвесьці базу для вывазу са строю на выпадак вайны ўсю электрастанцыю.

3. Шкодніцтва на Зуеўскай дзяржаўнай раённай электрастанцыі

Рад аварый, якія адбыліся на Зуеўскай электрастанцыі, па тэхнічнай ацэнцы экспэртнай камісіі сьведчаць аб аварыйным стане машын. У такі стан была прыведзена машына Макданальдам, які ў верасьні 1931 году прыбыў у Зуеўку. Макданальд у паказаньнях гаворыць, што ён ставіў перад сабой задачу сварыць працяжнае аварыйнае становішча на Зуўрэсе. Гэта задача, як ён сьцьвярджае, яму ў значнай меры ўдалася.

Макданальд ажыцьцяўляў шкодніцкія акты пры актыўным удзеле загадчыка турбінным цэхам інжынэра Катляроўскага, які прызнаўся ў шкодніцкай дзейнасьці. Паказаньні Катляроўскага аб аплаце яго контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці пацьвердзілі Макданальдам, прызнаўшым, што гі было перадана Катляроўскаму каля тысячы рублёў.

4. Шкодніцтва на Іванаўскай раённай электрастанцыі

Шкодніцкія акты па Івдрэсе праводзіліся контр-рэвалюцыйнай шкодніцкай групай, якая складалася з асобных прадстаўнікоў інжынэрна-тэхнічнага персаналу і арганізавала загадчыкам экспляатацыйнага аддзелу Івдрэсу інжынэрам Лабанавым з удзелам слухачага фірмы «Мэтра-Вікерс» інжынэрам Нордволам.

Нордвол, паводле слоў Лабанава, даў указаньне, якое абсталяваньне павінна было быць пашкоджана ў першую чаргу. Былі вызначаны мерапрыемствы па псаваньні турбін. Для ажыцьцяўленьня шкодніцкіх актаў Лабанаў прыцягнуў да ўдзелу майстра Лебедзева, старшага тэхніка Упрумава і сьлесара Котаева, якія да рэвалюцыі працавалі на заводзе бацькі Лабанава. У паказаньнях Лабанаў прызнаўся, што ён сыстэматычна выводзіў са строю маторы, рашоткі катлоў, знарок засьмечваў пяском падшыпнікі матораў пітальнай помпы катлоў, выводзіў са строю матор дымасосу катла № 5, у рэзультаце чаго згарела абмотка матора і кацёл № 5 быў выведзен са строю і г. д.

Як паказаў Лебедзеў са слоў Лабанава, Нордвол станіў сваёй мэтай падрыхтоўку выводу са строю ўсіх турбін Івдрэсу на выпадак абвяшчэньня вайны. Контр-рэвалюцыйныя шкодніцкія акты суправаджаліся подкупам і дачай хабараў. Паводле паказаньняў Лабанава, ён атрымаў 5.000 руб. У шкодніцтве на Івдрэсе прымаў удзел і Таритон.

Майстар транфарматорнай і масьлянай гаспадаркі Івдрэсу Зівэрт паказаў, што быў упрагнут у шкодніцтва Таритонам. Упярэдзіўшы Зівэрт пазнаёміўся з ім на Горкаўскай электрастанцыі, дзе Зівэрт працаваў па мантажы транфармараў фірмы «Мэтра-Вікерс».

Першае заданьне па шкодніцтве Зівэрт атрымаў ад Таритона ў чэрвені 1930 году, прычым тады-ж атрымаў ад Таритона 500 руб.

У рэзультаце шкодніцкай дзейнасьці Зівэрта ў 1931-32 г. г. быў рад аварый з электрычнай часткай абсталяваньня Іванаўскай ДРЭС. На працягу 10 месяцаў здарылося 15 аварый з прыводамі масьлянікаў.

5. Шкодніцтва на электрастанцыях, якія ўваходзяць у сыстэму „Масэнэрга“

На працягу 1927—32 г. г. на электрастанцыях «Масэнэрга» адбыўся рад аварый. Гэтыя аварыі былі рэзультатам шкодніцкіх актаў інжынэраў Сухаручкіна, Крапюньнікава і Зорына, якія дзейніч

АБВІНАВАЎЧАЕ ЗАКЛЮЧЭНЬНЕ ПА СПРАВЕ АБ ШКОДНІЦТВЕ НА ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯХ

(ПРАЦЯГ)

У результаце некалькіх год работы Кутузава «прыйшла да заключэньня, што ўсе гэтыя особы займаюцца эканомічнымі і палітычнымі шпіёнскамі і ўсе весткі, якія збіраюць, перасылаюць у Англію».

«Нарэшце, Тарнтон, — паказвае Кутузава, — мне расказаў, што ён і іншыя ангельскія інжынеры збіраюць сакрэтныя весткі палітычнага і эканамічнага парадку праз завербаваных імі рускіх інжынераў і тэхнікаў, якім плацяць за гэта грошы».

Па пытаньні аб удзеле ангельскіх інжынераў у правядзеньні дыверсыйных актаў, Кутузава паказвае: «Я некалькі раз чуў, як Тарнтон і Манкгаўз называлі шляхі пазашчэньня турбін на Нідрэс, Зуйрэс, ленінградскіх і іншых электрастанцыях».

Тарнтон і іншыя служачыя фірмы, якіх паказваюць Кутузавай, перадавалі весткі і падначальніку Ліндсэю, які выдаўляецца дырэктарам канструктыўнага аддзелу фірмы «Мэтра-Вікерс» у Англіі. У СССР кіраўнікамі шпіёнскай, дыверсыйнай дзейнасьці зьяўляюцца Тарнтон і Манкгаўз.

Пры допыце Молкгаўз пацьвердзіў, што ён атрымліваў весткі, якія адносяцца да характарыстыкі агульнага становішча ў Савецкім саюзе і аб становішчы вялікіх будаўніцтваў, якія вядуцца ў СССР. Манкгаўз пацьвердзіў, што ён прыймаў удзел у дачы хабару Тарнтонам загадчыку кантрольнага аддзелу «Электраімпарту» Долгаву. Манкгаўз прызнаў палучаньне ўтойных дэфэктаў, якія выклікалі аварыі машын, змантаваных персаналам конторы «Мэтра-Вікерс» на радзе тых электрастанцый, дзе дзейнічалі шкодніцкія і шпіёнскія групы. Манкгаўз адмаўляў свой удзел у збіраньні вестак, носьных характар ваеннай або ваеннай тайны, у дачы хабароў за ўтойваньне дэфэктаў абсталяваньня і ў арганізацыі псаваньня абсталяваньня і арганізацыі аварый на электрастанцыях СССР. Адзнак, нічога апрача голых адмаўленьняў Манкгаўз ня мог прадпрыймаць фантам, згадзьтым сьледзтвам. Аб характары сабраных вестак яснае ўяўленьне дае суд спэцыяльнага трыбунала Вярхоўнага суда Саюзу ССР па абвінавачэньні:

1. Вітвіцкі Мікалай Пятровіч, інжынер-механік, у 1921 годзе за ўдзел у белагвардзейскім крапшпітацкім паўстаньні прысуджан да 5 год, па амністыі вызвалены, у тым, ён, Вітвіцкі, ступіўшы ў 1927 годзе ў г. Златаўстаўскае ў шкодніцкую контр-рэвалюцыйную групу і ў далейшым, у 1931 годзе, у г. Чалябінску стаўшы кіраўніком контр-рэвалюцыйнай групы і ўвайшоўшы ў сувязь з Тарнтонам і па яго заданьні асабіста прымаў удзел і прыцягваў да ўдзелу іншых шкодніцкіх і, у прыватнасьці, буйных дэфэктаў на Чалябінскім, неўпіных заводах вынад са строю турбін у момант чаканай вайны супроць СССР; прымаў удзел у дыверсыйных актах, якіх вынікам дезарганізацыю работы станцый і перабоі ў снабжэньні энергіяй; атрымаў за гэтыя акты хабар у 6.900 руб., — г. зн. у злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 58-7, 58-9 і 58-11 крымінальнага кодэксу РСФСР.

2. Гусеў Васіль Алексеевіч в вышэйшай тэхнічнай асьветай, у тым, што, зьяўляючыся начальнікам Златаўстаўскай электрастанцыі і будучы ў контр-рэвалюцыйнай групе, арганізаваў і ўзначаліў контр-рэвалюцыйную шкодніцкую групу, якая паставіла сабе мэтай дезарганізацыю работы Златаўстаўскай электрастанцыі, сістэматычна зьбіраў і перадаваў Ліндсэйскаму рад сакрэтных вестак ваенна-дзяржаўнага значэньня, арганізаваў рад дыверсыйных і шкодніцкіх актаў, за сваю шпіёнскую і шкодніцкую дыверсыйную работу атрымліваў ад Ліндсэйскага хабары, — г. зн. у злачынстве, прадугледжаным арт. арт. 58-7, 58,9, 58-11 КК РСФСР.

3. Грэгорыс Альбэрт Вільям в вышэйшай тэхнічнай асьветай, ангельскі падданы, — у тым, што працаваў у 1932 г. у СССР у якасьці інжынэра ангельскай фірмы «Мэтра-Вікерс», будучы ў шкодніцкай контр-рэвалюцыйнай групе, займаўся зьбіраньнем са крытных вестак ваенна-дзяржаўнага значэньня і перадачай іх Тарнтону, — г. зн. у злачынствах, прадугледжаных арт. арт. 58-6 і 58-11 КК РСФСР

4. Зікэрт Юры Іванавіч, сынсоар, з нижэйшай асьветай, — у тым, што, працуючы на Нідрэсе, перадаваў Тарнтону сакрэтныя весткі, якія адносяцца да новых заказаў на электрааабсталяваньне і становішча Нідрэсу і апрача таго на заданьні Тарнтона арганізаваў рад шкодніцкіх дыверсыйных актаў, атрымаў хабар ад Тарнтона 500 руб., — г. зн. у злачынствах, прадугледжаных арт. арт. 58-6, 58-7, 58-9 і 58-11 КК РСФСР.

5. Зорын Мікалай Грыгэравіч, інжынер-механік, — у тым, што, займаючы пасаду старшага інжынера цеплавой групы на турбінай гаспадарцы «Масэнэрга», зьяўляючыся ўдзельнікам контр-рэвалюцыйнай групы, дзейнічаючы па заданьні Алейніка і Тарнтона, правёў на 1-ай МДЭС рад шкодніцкіх актаў, за што атрымаў ад Тарнтона 900 руб., — г. зн. у злачынстве, прадугледжаным арт. арт. 58-7 і 58-11 КК РСФСР.

7. Катляроўскі Майсей Львовіч, інжынер-механік, у тым, што, займаючы пасаду загадчыка турбінным цэхам Зуйскай электрастанцыі, зьяўляючыся ўдзельнікам контр-рэвалюцыйнай групы і дзейнічаючы па заданьні Манкгаўза, уцойваў дэфэкты абсталяваньня, якое пастаўляла фірма «Мэтра-Вікерс», што прыводзіла да аварый на станцыі, і за сваю шкодніцкую работу атрымаў ад Манкгаўза хабар у суме 2.000 руб., — г. зн. у злачынстве, прадугледжаным арт. арт. 58-7 і 58-11 КК РСФСР.

8. Кутузава Анна Сяргееўна, з сярэдняй асьветай, у тым, што, працуючы ў канторы фірмы «Мэтра-Вікерс» у якасьці сакратара, прымала ўдзел у контр-рэвалюцыйнай групе, якая праводзіла шкодніцкую, шпіёнскую і дыверсыйную работу, прычым, дзейнічаючы па заданьні Тарнтона і іншых ангельскіх інжынераў, перадавала ўзнагароды Гусеву і іншым рускім інжынерам і тэхнікам за іх шпіёнскую і шкодніцкую работу, — г. зн. у злачынстве, прадугледжаным арт. арт. 58-7, 58-6, 58-9 і 58-11 КК РСФСР.

9. Кушні Джон, акцыянэр ангельскай фірмы «Мэтра-Вікерс», ангельскі падданы, в вышэйшай тэхнічнай асьветай, — у тым, што, працуючы на радзе электрастанцый СССР у якасьці інжынэра і прымаючы ўдзел у контр-рэвалюцыйнай шкодніцкай групе, займаўся эканамічным і ваенным шпіянажам, арганізаваў на Бакінскай электрастанцыі дыверсыйныя і шкодніцкія акты, наўмысна рабіў недобрасумленны мантаж электраабсталяваньня і аплачваў шпіёнскую і шкодніцкую дыверсыйную работу паасобных рускіх інжынераў і тэхнікаў, — г. зн. у злачынствах, прадугледжаных арт. арт. 58-6, 58-9, 58,11 і 58-7 КК РСФСР.

10. Лебедзеў Вячаслаў Пятровіч, з сярэдняй асьветай, — у тым, што, зьяўляючыся майстрам Нідрэсу, быў членам контр-рэвалюцыйнай групы, псаваў абсталяваньне, атрымаў ад Манкгаўза хабар каля 900 руб., — г. зн. у злачынствах, прадугледжаных арт. арт. 58-7, 58,9 і 58-11 КК РСФСР.

11. Лабакаў Аляксандар Цімафэевіч, сын заводчыка, з вышэйшай тэхнічнай асьветай, — у тым, што, зьяўляючыся начальнікам эксплёатацыйнага аддзелу Нідрэсу, дзейнічаючы па заданьні Нордвола, арганізаваў і ўзначаліў на Нідрэсе контр-рэвалюцыйную шкодніцкую групу і зрабіў рад шкодніцкіх дыверсыйных актаў і атрымаў ад Нордвола хабар у 5.000 руб. і футру, г. зн. у злачынствах, прадугледжаных арт. арт. 58-7, 58-9 і 58-11 КК РСФСР.

12. Манканальд Вільям Ліанэль, з вышэйшай тэхнічнай асьветай, ангельскі падданы, — у тым, што, працуючы на электрастанцыі ў Златаўсту ці і на Зуйрэсе ў якасьці інжынэра фірмы «Мэтра-Вікерс», прымаў удзел у контр-рэвалюцыйнай групе, дзейнічаючы па заданьні Тарнтона, зьбіраючы сакрэтныя весткі ваенна-дзяржаўнага значэньня, даючы заданьні аб правядзеньні дыверсыйных і шкодніцкіх актаў, выдаваў хабары ў агульнай колькасьці каля 10 тыс. руб., — г. зн. у злачынствах, прадугледжаных арт. арт. 58-6, 58-7, 58-11 КК РСФСР.

13. Манкгаўз Аллан, былы капітан інжынерных войск брытанскай армії, з вышэйшай тэхнічнай асьветай, ангельскі падданы, — у тым, што, працуючы ў СССР упаўнаважаным фірмы «Мэтра-Вікерс» і будучы ў контр-рэвалюцыйнай групе, зьбіраў праз сваіх падначаленых ангельскіх інжынераў, а таксама раду рускіх інжынераў і тэхнікаў, сакрэтныя весткі ваенна-дзяржаўнага значэньня, прымаў удзел у шкодніцкай і дыверсыйнай дзейнасьці і выдаваў грашовыя сумы для аплаты шпіёнскай, дыверсыйнай і шкодніцкай работы, даваў хабары раду рускіх інжынераў за ўтойваньне імі дэфэктаў у абсталяваньні, якое пастаўляла фірма «Мэтра-Вікерс», — г. зн. у злачынствах, прадугледжаных арт. арт. 58-6, 58-7, 58-9 і 58-11 КК РСФСР.

14. Нордвол Чарльз, з вышэйшай тэхнічнай асьветай, ангельскі падданы, — у тым, што, працуючы на Нідрэсе інжынэрам фірмы «Мэтра-Вікерс», даваў заданьні групе інжынераў і тэхнікаў Нідрэсу рабіць шкодніцкія і дыверсыйныя акты, аплачваючы готыя акты, і выдаў хабары на агульную суму ў 5.000 руб., — г. зн. у злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 58-7, 58-9 і 58-11 КК РСФСР.

15. Алейнік Пётр Ерэмеевіч, мацнёр па турбінах, — у тым, што, працуючы старшым мацнёрам фірмы «Мэтра-Вікерс» у Маскве, зьяўляючы ся ўдзельнікам контр-рэвалюцыйнай групы, дзейнічаючы па заданьнях Тарнтона і Манкгаўза, збіраў сакрэтныя весткі ваенна-дзяржаўнага значэньня і перадаваў Тарнтону, арганізаваў рад шкодніцкіх дзеяньняў на радзе электрастанцый СССР, вербаваў шкоднікаў для контр-рэвалюцыйнай арганізацыі, — г. зн. у злачынстве, прадугледжаным артыкуламі 58-6, 58-7 і 58-11 КК РСФСР.

16. Сухаручкін Леанід Аляксандравіч, сын гандляра, інжынер-электрык, — у тым, што, займаючы пасьлядоўна пасады загадчыка электратэхнічнага аддзелу і начальніка эксплёатацыйнага аддзелу ў першай МДЭС, зьяўляецца ўдзельнікам контр-рэвалюцыйнай групы, дзейнічаючы па заданьнях інжынэра Тарнтона, зрабіў рад шкодніцкіх дзеяньняў, атрымаў ад Тарнтона хабар у 2.500 руб. у саветкай валюце і 350 руб. таргсінаўскімі бонамі, — г. зн. у злачынстве, прадугледжаным артыкуламі 58-7, 58-9 і 58-11 КК РСФСР.

17. Тарнтон Лесьлі Чарльз, сын буйнага фабрыканта, ураджэнец Ленінграду, ангельскі падданы, у тым, што ў 1927—33 г. працуючы ў СССР у якасьці старшага мантажнага інжынэра фірмы «Мэтра-Вікерс», займаўся зьбіраньнем праз рад савецкіх інжынераў і тэхнікаў сакрэтных вестак ваенна-дзяржаўнага значэньня асабіста і праз падначаленых яму ангельскіх інжынераў—Манканальда, Кушні і інш. даваў заданьні раду савецкіх інжынераў і тэхнікаў рабіць шкодніцкія, дыверсыйныя акты і сістэматычна падчышчаў рад інжынераў і тэхнікаў—Гусева, Зорына, Сокалава і інш., аплачваючы іх шпіёнскую, дыверсійную і шкодніцкую работу, а таксама за ўтойваньне імі дэфэктаў у абсталяваньні, якое пастаўляла фірма «Мэтра-Вікерс», — г. зн. у злачынствах, прадугледжаных арт. арт. 58-6, 58-7, 58-9 і 58-11 КК РСФСР.

18. Сокалаў Васіль Андрэевіч, сын самаатыжніка, скончыў златаўстаўскае тэхнічнае вучылішча і шкоду ліку на класе электрамеханікі, тэхнік электра-механік, дзяржаўны служачы, — у тым, што ён, Сокалаў, уступіў ны летам 1930 году ў Златаўсту ў члены контр-рэвалюцыйнай групы, якая дзейнічала на златаўстаўскім заводзе пад кіраўніцтвам начальніка сілавой станцыі інжынэра Гусева і паставіла сабе палазаныя вышэй контр-рэвалюцыйныя мэты, зрабіў рад шкодніцкіх дзеяньняў і дыверсыйных актаў для падрыхтоўкі шырокай дыверсіі на выпадак вайны супроць СССР і атрымаў хабар за сваё сыстоматычнае шкодніцтва ў суме 1.000 рубляў, — г. зн. у злачынствах, прадугледжаных артыкуламі 58-6, 58-7, 58-9 і 58-11 КК РСФСР.

Вобыск у нам. гандлёвага прадстаўніка СССР у Германіі

БЭРЛІН, 13. Обыцня ўранку на ніватэру нам. гандлёвага прадстаўніка Савецкага Саюзу т. Файнштэйна зьявіліся 2 агенты палітычнага аддзелу берлінскай паліцыі і пачалі ў яго адсутнасьці рабіць вобыск. Калі таў. Файнштэйн па выкліку сваёй жонкі прыбыў дамоў, агенты паліцыі яму заявілі, што яны робяць вобыск па даручэньні свайго начальніка і патрабавалі ў т. Файнштэйна прад'явленьня яго дакумэнтаў. Ня гледзячы на пратест т. Файнштэйна і на прад'явленьне ім дыпляматычнага пашпарту, агенты правядзілі вобыск далей. У іх на руках мелася спіс, у якім су проць прозьвішча т. Файнштэйна быў указан нумар яго дыпляматычнага пашпарту. Агенты палі себя выключна груба. Пратакол аб вобыску ня быў складзен. На патрабаваньні т. Файнштэйна, складзіць пратакол агенты заявілі, што яны яго складуць ва ўстанове. Вобыск скончыўся еўсім безрэзультатна. Паўвалоцнае прадстаўніцтва СССР у Берліне заявіла рашучы пратест супроць незаконнага вобыску ў т. Файнштэйна.

ВЯЧЭРНЯЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ 12 КРАСАВІКА

У 6 гадзін пачынаецца допыт падсуднага Гусева. Гусеў расказвае пра сябе. Кастрычніцкую рэвалюцыю Гусеў сустрэў варожа. 20-ці год ён пасту пае ў якасьці дабраахвотніка ў вучэбную каманду аднаго з палкоў арміі Калчака. Гусеў характарызуе свае перажываньні таго пэрыяду «як варожыя Кастрычніцкай рэвалюцыі». Ён прымае ўдзел у баёх супроць Чырвонай арміі ў Уфімскай губерні. З жніўня да пачатку сьнежня 1919 г. ён зноў на ваеннай службе, на гэты раз у аўта-браневых часьцях арміі Калчака. Паніч нае адступленьне калчаковскіх банд выводзіць Гусева з роўнавагі, аднак перажываньні яго засталіся ранейшымі.

Апрача таго, пад уплывам асяродзьдзя, у якім Гусеў знаходзіўся на Златаўсьцінскай электрастанцыі (рад асоб, капрыклад, Шапаеў, Багаслаўскі і інш. асуджаны за шкодніцтва), яго антысавецкія настроі яшчэ больш узмацніліся.

У 1922 г. Гусеў канчае інстытут у Златаўсьце з годнасьцю інжынэра па «сквозных» установках і паступае на Златаўсьцінскую электрастанцыю, дзе займае рад пасад аж да начальніка электрастанцыі з сакавіка месяца 1929 г.

Пачатак шкодніцкай і шпіёнскай дзейнасьці Гусева, паводле яго слоў, адносіцца да пачатку 1930 г. У сьнежні 1929 г. Гусеў знаёміцца з інжынерам ангельскай фірмы «Мэтра-Вікерс» і завязвае з ім сяброўскія адносіны. З пачатку Манканальд прапанаваў Гусеву даваць інфармацыю аб выторчасьці Златаўсьцінскіх заводаў. У далейшым Гусеў атрымаў ад Манканальда прапанову даваць весткі аб электрааабсталяваньні ўсіх златаўсьцінскіх заводаў, якія працуюць на абарону, аб рабоце мэтаналіцейнага заводу, які выпускае аўтатэкстарныя рэсоры, аб цыйную сталь, шарыкападшыпнікавую сталь і г. д., а таксама аб ваеннай выторчасьці механічнага заводу і вырабе знарадаў.

Аб матывах сваёй дзейнасьці Гусеў гаворыць: «З прычыны таго, што я атрымліваў грошы за арганізацыю аварый, з гэтага выходзіць, што я не рабіў гэта з чыста ідэйных меркаваньняў, але я павінен прызнацца, што асноў нае—гэта мае пераконаньні». Гусеў па ведамляе, што грошы за сваю шкодніцкую шпіёнскую работу ён атрымліваў ад Манканальда.

Манканальд пацьвярджае паказаньні Гусева ў гэтай частцы, заяўляючы, што ён перадаў Гусеву грошы ў суме 3.500 руб. і гэтыя грошы ён атрымаў ад галоўнага інжынэра Маскоўскай канторы кампаніі «Мэтра-Вікерс», Тарнтона. Манканальд далей прызнаў, што справа ішла аб зьбіраньні вестак ваеннага характару.

Новым этапам шкодніцкай і шпіёнскай работы Гусева зьяўлялася выкананьне заданьняў па арганізацыі аварый на электрастанцыі.—«Для выкананьня такога заданьня,—гаворыць Гусеў,—я намецію шляхі расстройства энэргастанцыі і, з другога боку, я сабе мысьліў гэта шляхам выводу са строю матора ў 1.400 конскіх сіл буйнасортнага стану ў прыкатным цэху. Як паказвае Гусеў, гэты стан быў выбран іменна таму, што калі гэты стан не працуе, дык усе іншыя станы, якія даюць гатовую прадукцыю, і ў тым ліку ўсе знарадныя загатоўкі і аўтатрактарныя рэсоры, таксама не працуюць.

На пытаньне пракурора т. Вышынскага падсудны расказвае аб радзе канкрэтных фактаў шкодніцтва. Матор у 1.400 конскіх сіл быў выведзен са строю самім Гусевым, які наўмысна па кінуў невялікі кавалачак аркушнага жалеза ў вэнтыляцыйным канале. Гусеў прызнае, што ім была арганізавана «цэлая сэрыя аварый». Ім была праведзена затрымка мантажу катла № 11, затрымка пераробкі каплоў Стэрлінга №№ 1 і 2, шкодніцкі разабрана вуціла падача і г. д. Затым Манканальд пацьвярджае, што ён даваў указаньні Гусеву па арганізацыі гэтых аварый.

У распрацоўцы гэтага пляну, паводле слоў Гусева, прымалі ўдзел яго тольки Гусеў і Сокалаў, але і Манканальд. У далейшых паказаньнях Гусеў разгортвае карціну шкодніцкай дзейнасьці.

«Зімой 1931-32 г. кацёл № 8, у выкананьне намечаных шкоднікамі пляну, быў спынен у часе марозу з вадой і дымавы рэгістр у бораве ня быў закрыт. Кацёл быў выведзен са строю на тэрмін звыш паўтара месяцы. Каплы №№ 1 і 2 перарабляліся на пылападобным апале. Установка каплоў рабілася фірмай «Рэма». З прычыны прынятых Гусевым шкодніцкіх мер, гэта ўстаноў ка працягвалася 2 гады. Кацёл Стэрлінга не адрамантован на працяглу 2-х год, а мантаж новага катла № 11 зацягнуўся «тэрмінам да 2-х год». Гусеў заяўляе, што ўсе гэтыя акты зьяўляюцца вынікам сьвядомых шкодніцкіх дзеяньняў, якія зьяўляюцца часткай распраца ванага пляну аварыі.

Допыт падсуднага Гусева працягваецца нам. пракурора т. Рагінскі.

Адказваючы на пытаньні т. Рагінска га, падсудны Гусеў прызнае, што яго контр-рэвалюцыйная шкодніцкая работа йшла па 4-х лініях. Па-першае, зьбіраньне вестак сакрэтнага характару. Па-другое, падрыхтоўка і ажыцьцяўленьне псаваньня машын. Па-трэцяе, затрымка мантажу рознага абсталяваньня з мэтаю зацягнуць пошырэньне Златаўсьцінскай электрастанцыі.

Нарэшце, па-чацьвертае, сувязь паміж паасобнымі членамі контр-рэвалюцыйнай групы і інжынерам Манканальдам.

Затым Гусеў паказвае, што ў Златаўсьце, у часе прабываньня там Манканальда, двойчы прыяжджаў ад фірмы «Метра-Вікерс» інжынэр Тарнтон —першы раз улетку 1930 г., другі раз —зімой 1930-31 г. Да моманту яго першага прыезду Гусеў ужо зьбіраў шпіёнскія весткі на Златаўсьцінскіх заводах. Зьвесткі адносіліся да энэргазабесьпячэньня ваенных выторчасьці.

З прыехаўшым Тарнтонам Гусеў меў некалькі сустрэч. К зіме 1930-31 г. быў выпрацаван плян аварыі і контр-рэвалюцыйная група пераходзіла да непасрэдных дыверсыйных актаў. У другі прыезд Тарнтона плян дыверсыі быў абмяркован тройкай: Гусеў, Тарнтон, Манканальд. Плян у асноўным быў абдуман Тарнтонам. Тарнтон настойваў на правядзеньні на ЧапляБДРЭС'е пляну аварыі, заяўляючы, што ЧапляБДРЭС знаходзіцца пад іх уплывам».

У ходзе допыту Гусеў гаворыць аб тым, што задача яго контр-рэвалюцыйнай работы была сарваць электраазабесьпячэньне мэталюргічнага заводу ў часе вайны і што яму ўдалося ў выніку аварыі зьнізіць магутнасьць Златаўсьцінскай электрастанцыі напалову.

У ходзе допыту т. Вышынскім пад суднага Гусева высьвятляецца, што Манканальд—Гусеў карысталіся пры перапісцы ўмоўнымі выдуманымі прозьвішчамі: Іванова, Мачалава, Уткіна, а таксама ўказвалі на пасьпках фальшывыя адрасы адправіцеляў. Гусеў паведамляе, што ўдзельніні контр-рэвалюцыйнай групы насілі клічкі: «Фёдар» «Дрэва», «сылёсар» і інш.

Пры ад'езьдзе з Зуеўкі, куды ён быў запрошан Манканальдам,—паведамляе Гусеў,—ён меў гутарку на станцыі Хар цюк з Тарнтонам у прысутнасьці Манканальда. Гутарка цягнулася 20-30 хвілін. Ён, Гусеў, коратка паведаміў Тарнтону аб арганізаваных ім аварыях і адказаў на рад пытаньняў Тарнтона аб становішчы на Златаўсьцінскіх заводах.

РАГІНСКІ.—«Падсудны Гусеў, ваш ад'езд з Харціска у Златаўст быў зьвязан з якімі-небудзь новымі заданьнямі ці даручэньнямі па пытаньню аб мі ці даручэньнямі па пытаньню аб напрамку вашай шкодніцкай работы?

ГУСЕЎ—«Я павінен быў прыняць меры, каб магутнасьць электрастанцыі заставалася той, якая была дасягнута ў результаце нашай шкодніцкай дзейнасьці, г. зн. палавінная магутнасьць нармальней, а затым у выпадку вайны, выклікаць аварыі ў электра станцыі і ў заводзкім абсталяваньні, якія-б вялі да зрыву выторчасьці Златаўсьцінскіх заводаў у частцы выпуску высокаякаснай сталі, а таксама вы дуску знарадаў.

На пытаньне т. Вышынскага падсуднага Гусеў тлумачыць, што ужо ў першы прыезд Тарнтона ў Златаўст яму, Тарнтону было вядома, што Гусеў зай маецца шпіянажам па даручэньні Манканальда.

Допытаны падсудны Тарнтон прабуе адмаўляць гэта паведамленьне Гусева. Тав. Вышынскі чытае вытрымку з пратаколу вочнай стаўкі Тарнтона і Гусева 25 сакавіка, на якой Тарнтон паведаміў, што яму было вядома аб перадачы Гусевым Манканальду падрабязнай інфармацыі аб Златаўсьцінскім раёне.

Гэту сваю заўвагу на вочнай стаўцы Тарнтон пацьвярджае. Але калі тав. Вышынскі чытае далейшыя яго паказаньні на вочнай стаўцы, у якіх Тарнтон прызнаваў, што Гусеў быў давераным особаю па шпіянажу і шкодніцтве Тарнтона і Манканальда ў Златаўсьце, Тарнтон гэту частку свайго паказаньня ня адмаўляе. Далей адбыўся наступны цікавы дыялёг.

ВЫШЫНСКІ.—Дазвольце тады так запытацца: гэта вы гаварылі?

ТАРНТОН.—Гаварыў.

ВЫШЫНСКІ.—Значыць тое, што запісана ў пратаколе, ёсьць тое, што вы гаварылі?

ТАРНТОН.—Так, я гэта гаварыў.

ВЫШЫНСКІ.—Вы гаварылі праўду ці няпраўду?

ТАРНТОН.—У даным выпадку няпраўду.

ВЫШЫНСКІ.—Вы хацелі гаварыце праўду ці няпраўду?

ТАРНТОН.—У даным выпадку гаварыў няпраўду—я быў усхваляваны.

ВЫШЫНСКІ. — Значыць, калі вы ўсхваляваны, вы гаварыце няпраўду?

ТАРНТОН.—Так.

ВЫШЫНСКІ.—Зараз вы не ўсхваляваны?

ТАРНТОН.—Не ўсхваляваны.

ВЫШЫНСКІ.—Значыць, вы зараз га варыце праўду?

ТАРНТОН.—Зараз гавару праўду.

ВЫШЫНСКІ.—Чаму вы, аднак, калі сапі так, а ня інакш? Вы сказалі: «Думаю, што гэта так». Я пытаюся, чаму вы, будучы ўсхваляванымі, думалі іменна гэтак, а ня што-небудзь іншае?

Вас прымушалі?

ТАРНТОН.—Не.

ВЫШЫНСКІ.—Вы добраахвотна гэта сказалі?

ТАРНТОН.—Добраахвотна

ВЫШЫНСКІ.—Можа быць пры допыце вас ужывалі асобныя мэтады?

ТАРНТОН.—Не.

ВЫШЫНСКІ.—Мучылі вас?

ТАРНТОН. Не.

ВЫШЫНСКІ.—Трэцяя ступень? *)

ТАРНТОН.—Не.

ВЫШЫНСКІ.—Я больш пытаньняў ня маю.

У часе допыту падсуднага Гусева абаронцам Казначэевым Гусеў паказаў, што Манканальд рэкамендаваў яму ў выпадку правалу адмаўляць усякую сувязь з ім (Манканальдам) і абяцаў арганізаваць у выпадку необходнасьці на ват пабег заграніцу. Абаронца Казначэеў просіць Гусева ўдакладніць яго цяперашнія адносіны да сваёй шкодніцкай дзейнасьці. Гусеў гаворыць, што ў яго яшчэ да арышту адбыўся пералом. Пасьля арышту ён ня стаў утойваць сваё злачынства і калі яму будзе захавана жыцьцё, ён зробіць усё, каб загладзіць сваю віну.

Абаронца Сьмірноў пытаецца Гусева, як растлумачыць тое, што шкодніцкія акты былі праведзены пасьля ад'езду Манканальда з Златаўста. Гусеў заяўляе, што стрымаў дырэктывы ад Тарнтона і Манканальда, каб усе дыверсыйныя акты, якія былі вызначаны, былі арганізаваны толькі ў іх адсутнасьці. Далей Сьмірноў задае Гусеву пытаньне адносна грашовых сум, атрыманых ім ад Манканальда. Гусеў указвае, што ён атрымаў ад Манканальда 5 тысяч руб. перад ад'ездам апошняга.

Абаронца Манканальда Сьмірноў прабуе зьбіць Гусева, упікаючы яго ў тым, што ён ніби раней на сьледзтве не гаварыў аб гэтых 5 тысячах рублёў. Стар шыня Ульрых спыняе абаронцу і абвяшчае паказаньні Гусева на сьледзтве аб гэтых 5 тысячах рублёў.

Абаронца Тарнтона Броўдэ пытаецца Тарнтона, ці пацьвярджае ён паказаньне Гусева аб сваёй сустрэчы з Вітвіцкім. Тарнтон зноў прабуе сьцьвярджаць, што ня ведаў аб шкодніцкай дзейнасьці Гусева і што Гусеў сабраў для фірмы інфармацыю аб рабоце абсталяваньня, пастаўленага фірмай, аб катлах і трансформатарах, каб своечасова папярэдзіць сварыю.

Тарнтон адмаўляе, што ён аплачваў Гусева за перадачу інфармацыі.

Тав. Вышынскі паўторна ўносіць на суперэчнасьць паміж паказаньнем Тарнтона на попярэднім сьледзтве і яго адказам Броўдэ. На сьледзтве Тарнтон заявіў, што з пункту погляду інтэрэсу фірмы яго Златаўст цікавіць мала, бо там была толькі адна маленькая турбіна, а абаронцу ён адказаў, што яму былі необходны сведкі аб становішчы на Златаўсьцінскай электрастанцыі.

Тарнтон прызнае, што супярэчнасьці ў паўнасьці і ўкажае, што-гэта трэба разумець так, што Златаўст яго цікавіў менш, чым станцыі большых памераў. Тарнтон, які да гэтага часу даваў паказаньні па-руску, каб ухіліцца ад дакладных фармулёвак, пераходзіць з рускай на ангельскую мову і дае да лей паказаньні праз перакладчыка.

Суд адхіляе яго просьбу ў перакладчыку і адначасова старшыня суда высьвятляе, што Тарнтон урадзіў нец Пецярбургу і ўсе апошнія 8 год жыў у СССР. Пасьля гэтага Тарнтон зноў пераходзіць на рускую мову.

Тав. Вышынскі задае пытаньне аб перадачы Тарнтонам Манканальду 1.500 руб. на аплату інфармацыі аб Златаўсьце. На пытаньне пракурора Тарнтон адказвае, што ён перадаў Манканальду 2 тысячы рублёў, але калі грошы былі даны яго на аплату за інфармацыю, дык на якія мэты былі асыгнаваны гэтыя 2.000 руб.—Тарнтон ня можа нічога адказаць.

Пасьля некаторых дадатковых пытаньняў т. Рагінскага і абаронцы Сьмірнова допыт Гусева канчаецца. Абвяшчаецца перапынак да 10 гадзін раніцы 13-га красавіка.

*) У ангельскай прасе было паведамленьне да працэсу аб тым, што да абвінавачаных кібы была ўжыта так званая «трэцяя ступень» допыту, якая выражаецца ў асобных, недазвушчальных па закону прыёмах сьледзтва. Тарнтон вымушан сам адкінуць гэту хлусьню.

УСЕБЕЛАРУСКІ КОНКУРС НА ЛЕПШАЕ СЕЛЬСПАЖЫЎТАВАРЫСТВА

Шырэй фронт сацспаборніцтва на лепшае абслугоўваньне пасеўнай!

Першачарговым снабжэньнем ударнікаў сяўбы, таварным байкотам лодыраў, шырокім ахопам калгаснікаў грамадзкім харчаваньнем забясьпечым актыўны ўдзел вясковай каапэрацыі ў падрыхтоўцы да сяўбы

Спажывецкае таварыства і калгасны конь

ЛЕПШЫ ВОПЫТ КААПЭРАЦЫІ СЛУЧЧЫНЫ—ВА УСЕ ССТ

СЛУЦАК. Вясковае спажывецкае таварыства і калгасны конь? Большасьць вясковых каапэратараў БССР адказуць, што ПРАКТЫЧНА такая пастаноўка пытаньня немагчыма.

— Мы разумеем вялікае значэньне падрыхтоўкі да вясны. Агітацыяй, растлумачэньнай работай дапамагаем партыі і савецкай уладзе змагацца за працаздольнага каня, заключаем з калгасамі дагаворы на пераважнае снабжэньне ўдарнікаў калгасаў. Але якія непасрэдныя адносіны да калгаснага каня можа мець сельскае спажывецкае таварыства?

— Гэтыя залавы многіх каапэрацыйных работнікаў ярка адлюстроўваюць фактычнае становішча. Сельская спажывецкая сыстэма БССР рэальнага, канкрэтнага ўдзелу ў падрыхтоўцы да сяўбы, як правіла, не прымае.

У сьвятле гэтага асабліва цікавы вопыт спажывецкай сыстэмы Слуцкага раёну — вядучага ў БССР сельскагаспадарчага раёну. Гэты вопыт заслугоўвае папулярызацыі і максымальнай увагі.

СЛУЦКІ РАЙСАЮЗ АРГАНІЗАВАЎ КОНКУРС СПАЖЫВЕЦКІХ ТАВАРЫСТВАЎ НА ЛЕПШУЮ ПАДРЫХТОЎКУ КАЛГАСНАГА КАНЯ ДА СЯЎБЫ. Рай саюз гэтым прымусіў нізавую сыстэму аддець выключную ўвагу аднаўленьню працаздольнасьці рабочай жывёлы. Умовы конкурсу выключалі ўсякую магчымасьць абмежавацца парадными дэкларацыямі. У конкурсе выразна і ясна акрэслены задачы сельскіх спажывецкіх таварыстваў.

Райсаюз паставіў перад нізоўкай пытаньне аб тым, што ЯНА АДКАЗВАЕ ЗА ПАДРЫХТОЎКУ КАЛГАСНАГА КАНЯ НАРАЎНЕ З ЗЯМЕЛЬНЫМІ І ІНШЫМІ ОРГАНАМІ. Уключыўшыся ў конкурс, сельскае спажывецкае таварыства павінна была ажыўна ўмяшацца ў справы на стайні, практычна далямагчы, пры ўдзеле каапактыву і шырокай масы пайшчыкаў, навесьці парадак у стайні.

Перад тым, як заключыць дагаворы з конюхамі, сельскія спажывецкія таварыствы павінны былі правесьці вялікую арганізацыйна-масавую работу: сходы каапактыву калгасу, агульныя сходы пайшчыкаў, праверку становішча коняй, сходы конюхаў і г. д. Дагавор заключан быў заноцаваць праведзеную вялікую работу, вызначыць далейшыя абавязкі брыгады конюхаў па ліквідацыі вылуленых недахопаў, вызначыць абавязацельствы ССТ па пераважным і лепшым снабжаньні прамтаварамі ўдарнікаў калгасных стайні.

Асабліва добра правяло конкурс СЕРАДНЯКОЎСКАЕ СЕЛЬСКАЕ СПАЖЫВЕЦКАЕ ТАВАРЫСТВА. У гэтым вялікая заслуга старшыні таварыства тав. КІЯВІЦКАГА, які на справе даказаў, што ён зьяўляецца ўдарнікам каапэрацыі. Ён ня толькі вызначыў спэцыфічныя абавязкі калгасаў, якія ім абслугоўваюцца, але дэталёва, знаёмыся з пярэдкамі ў кожнай калгаскай брыгадзе.

Па трох калгасах сельскае спажывецкае таварыства правяло ўжо вялікую работу па падрыхтоўцы рабочай жывёлы да вясны. Увесь каапактыў і ўся маса пайшчыкаў гэтых калгасаў уцягнуты ў конкурс. Сераднякоўскае ССТ да заключэньня дагаворў з брыгадамі конюхаў правяло агульна-калгасныя сходы і нарады па брыгадах, выявіўшы становішча стайняй, сабраўшы канкрэтныя прапановы калгаснікаў для ліквідацыі недахопаў.

На сходзе калгаснікаў каняводчай с.-г. арцелі імя Будзённага радавыя пайшчыкі паведамілі аб непарадках на стайні. Адзначыўшы, што каняводчы калгас абавязан паказваць пры

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Партыйна-масавую работу—на палі, у калгасныя брыгады

„Так перабудаваць работу ячэйкі, каб пытаньні вытворчага жыцьця калгасаў (стварэньне пастаянных брыгад, падбор брыгадзіраў, зьвеньнявых вучотчыкаў, аратых, сейбітаў, конюхаў, нармаваньне працы, догляд каня, якасьць ворыва, сяўбы, уборкі, працоўная дысцыпліна і інш.) складалі асноўны зьмест работы ячэйкі"

(З пастановы ЦК УсеКП(б) ад 22 сакавіка)

СПАБОРНІЦТВА БРЫГАД

РАГАЧОЎ, 12.

Некаторыя калгасы Рагачоўскай МТС прыступілі да палявых работ. Калгасы разгортваюць ворыва, рыхтуючы глебу пад раньнія яравыя культуры.

Калгас «Першы май» ужо ўзараў 16 га і засеяў 1 га ільну. Уводна пра куе пазаводчая брыгада тав. Ф. Падава. Брыгада перавыконвае нормы выпрацоўкі. Аратыя ў гэтай брыгадзе даюць высокія паказальнікі работы, узорваючы па 1 га. У брыгадзе прапрацаваны пастановы ўсесаюзнага і ўсебеларускага зьездаў калгасьнікаў-ударнікаў.

У адказ на пастановы зьездаў у калгас уступіла 7 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Пачаў ворыва таксама калгас «Шлях Леніна». Калгасьнікі ўжо ўзаралі 10 га. Апрата таго ўзарана 8 га цалины.

Дэлегаты першага ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў, якія былі пасланы на зьезд ад раёну, паказваюць прыклад арганізацыі калгасных мас на бальшавіцкае праязьдзеньне сяўбы.

Дэлегат зьезду тав. Берштэйн зрабіў справаздачу ў калгасе «Інтэрнацыянал» аб рабоце і выніках першага ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў. У адказ на пастановы зьезду калгасьнікі абвясьцілі сябе ўдарнікамі першай сяўбы другой сацыялістычнай пяцігодкі.

Колгас, які зьяўляецца адным з самых буйных с.-г. арцелей раёну, выйшаў у поле. За адзін дзень падрыхтаваны пад раньнія яравыя культуры 18 га пахаці і засеяны 1 га ільну. На палі вывезена 200 вазоў гною.

Памёк брыгадамі заключаны сацыялістычныя дагаворы. Брыгады абвяшчаліся ўзяць ураджайнасьць яравых культур на 65 проц. параўнальна з мінулым годам. На час весьнавой сяўбы арганізаваны брыгадныя палявыя пасьцешнагазэты.

Палітаддзелы разгортваюць работу

У Беларусі пачынаюць працаваць палітаддзелы МТС і саўгасаў. 30 начальнікаў палітаддзелаў МТС ужо цьвердзілі праз адборачныя камісіі ЦК КП(б)Б і ЦК УсеКП(б). Намесьнікаў начальнікаў палітаддзелаў МТС па партрабоце адабрана 32, па камсамольскай рабоце—таксама 32. Значная частка намесьнікаў ужо знаходзіцца на месцах і разгортваюць работу палітаддзелаў.

Па саўгасах Беларусі арганізавана 23 палітаддзелы. Начальнікі палітаддзелаў ужо зацьверджаны. Намесьнікаў начальнікаў па партрабоце зацьверджана 24, памочнікаў па камсамольскай рабоце—30.

У першую чаргу камплектуюцца палітаддзелы ў раённых раёнах. Прыступілі да работы палітаддзелы МТС у Слуцкім, Менскім, Заслаўскім, Полацкім, Дрысенскім, Рагачоўскім, Бабруйскім, Лепельскім і Аршанскім раёнах.

Некаторыя палітаддзелы ўжо пасьпелі правесьці значную работу. Палітаддзел Слуцкай МТС праверыў склад трактарыстаў. З 74 трактары стаў 11 выкінута як класа-варожы элемэнт, 13 звольнена з-за нізкай кваліфікацыі. За кожным трактарыстам замацоўваюцца машыны і інвэнтар. Для разгортваньня палітмасавай работы у калгасах і на вучастках МТС арганізавана антыфурманка.

Палітаддзел саўгасу імя Сталіна, Дзяржынскага раёну, прыступіў да перабудовы партыйнай і камсамольскай работы, правільнай расстаноўкі рабочай сілы і разгортваньня сацыялістычнага саўгас пры дапамозе палітаддзелу пашаў з прарыву і заняўшыся падрыхтоўку да сяўбы. Палітаддзел правёў чыстку саўгасу ад клясава-варожых элемэнтаў. Вычыстана 13 чалавек.

На чале палітаддзелаў пастаўлены лепшыя бальшавікі. Так, напрыклад, начальнікам палітаддзелу Заслаўскай МТС зацьверджан тав. **Васковіч**, член партыі з 1917 году, які мае ва лікі вопыт партыйна-палітычнай работы ў Чырвонай арміі. Начальнікам палітаддзелу Полацкай МТС зацьверджан тав. **Берзін**—член партыі з 1919 году, старшыня Белбюро саюзу чыгуначнікаў. Начальнікам палітаддзелу Аршанскай МТС зацьверджан тав. **Разумаў**—стары член партыі, старшыня вінсбскага гарпрафсавету, мае вялікі вопыт палітычнай работы ў Чырвонай арміі, партыйнай работы ў гомельскай партыйнай арганізацыі. Начальнікам палітаддзелу Слуцкай МТС ужо працуе тав. **Бангайцыс**—член партыі з 1919 году, выпрабаваны бальшавік.

Прыступіў да работы палітсэктар Наркамзему БССР. Начальнікам палітсэктару зацьверджан т. **Пыжыкаў** — сакратар полацкага райкому КП(б)Б.

У значнай частцы палітаддзелаў ужо працуюць намесьнікі начальнікаў. Учора і сёньня выехала на работу група начальнікаў палітаддзелаў. Праз некалькі дзён выкінуцца на работу яшчэ адна група начальнікаў. Яшчэ ў сьнежні 1932 году наркамзем СССР тав. Якаўлеў паслаў дырэктарам МТС тэлеграфнае распараджэньне аб забесьпячэньні работнікаў палітаддзелаў кватэрамі. Ня гледзячы на тое, што прайшоў значны час, **кватэры яшчэ не падрыхтаваны.** У двух МТС Менскага раёну работнікам палітаддзелаў не прадастаўляюць кватэр выходзячы з таго, што яны, маў, могуць жыць у Менску. Гэты довад не вытрымлівае ніякай крытыкі, бо ад адной МТС да Менску 12 клм., ад другой—3-4 клм. Зразумела, што пры такім стаўленьні работнікі палітаддзелаў будуць адарваны ад калгасаў. **Работнікі палітаддзелаў павінны жыць на тарыторы МТС.**

Трэба сказаць, што Наркамзем Беларусі не правёў выстарчальнай ініцыятывы ў адносінах забесьпячэньня работнікаў палітаддзелаў кватэрамі.

А.

„Лепшая" ячэйка да сяўбы не падрыхтавалася

Сіроцінскі РК КП(б)Б ня ведае становішча сваіх ячэек

(Ад нашага карэспандэнта)

Лаўжанская партячэйка—адна з буйнейшых ячэек у Сіроцінскай партарганізацыі, і яе РК КП(б)Б лічыць адной з лепшых. Аб'ект вартыі для вывучэньня. Едзем. Знаёмімся.

У Лаўжанскай партячэйцы 7 членаў партыі і 12 кандыдатаў. А было больш. У час ільнозагатоўчай кампаніі вычыстана 8 чалавек. Трэба думаць, што, вычысьціўшыся ад перараджэнцаў і прыспасобнікаў, ячэйка не аслабла, а яшчэ больш стала моцнай. Трэба думаць, што з бою за лён каму пасты лаўжанскай парт'ячэйкі выпыі загартаваемымі, з багатым вопытам барацьбы з клясавым ворагам, барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

На жаль, факты гавораць аб іншым. Даю слова фактам.

Як расстаўлены камуністы? Сакратар партячэйкі, ён-жа загадчык сямігодкі, тав. Якгураў лічыць па пальцах:

— **Я—пэдагог і адміністратар;** Саўчанка—**старшыня сельсавету,** Баранікоў—**загадчык вытворчага вучастку МТС,** Арлоў—**намесьнік старшыні сельсавету,** Фрадкоў—**старшыня сельспанмыўтаварыства; пяць старшынь калгасаў;** Ісьянава—**была загадчыкам сталовай, зараз часова «беспрацоўная»,** працуе хатняй гаспадыняй; далей—**дырэктар луггасу, дырэктар цагельні, загадчык гаспадаркі цагельні;** Дубаў—**загадчык гаспадаркі калгасу,** Арлова—**вучотчыца малочка ў калгасе і скарбнік—вось амаль усе нашы людзі і ўсе камісары!**

Так, «камісараў» багата.

Хто-ж працуе без партфэлю, непасрэдна на вытворчасьці—у брыгадзе, майстэрні, стайні?

— Кандыдат партыі, былая батрачка, **Дзедзель,** у калгасе «Чырвоная лоўжа» і каваль **Ткачоў** у калгасе «Чырвонае Юрава». 1 ўсе.

Працуе, і «камісарыт», прымацаваныя да пэўных вучасткаў або пунктаў, але **як** яны там працуюць, ці ўнікаюць у «дробязі» калгаснага жыцьця і працы, ячэйка ня ведае. Ніякай работы з кандыдатамі партыі не вядзецца. Возьмем за прыклад Дзедзель, былую батрачку, кандыдата партыі, без адміністрацыйнай пасады. Дзедзель крыўдзіцца:

— Парткомы даўно былі. Вушоба з кандыдатамі адсутнічае. У калгасе прамадзкай работы не даюць, кажуць—няма. Летась была ўдарніцай, а сёлета не. Працаваць хочацца, але...

Ня лепш і з беспартыйным актывам. Хто лічыцца ў беспартыйным сельсавецкім і калгасным актыве? Настаўнікаў—22, кашпаратараў—3, лугасаўцаў—3. А колькі і дзе нізавы, сямы дзейны актыў—партячэйка ня ведае.

Партячэйка ня ведае што робіць лепшы актывіст-ударнік калгасу «Зара свабоды» тав. **Лапухоў Абрам,** дэлегат на 1 ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў! Выбраці, паслалі, прыехаў—і забылі. На партячэйку, ні раённыя арганізацыі не клапоцяцца аб сваіх дэлегатах: усе яны забыты. Што-ж тады гаварыць аб рабоце з іншым калгасным актывам? Нечага, бо яе няма ні ў Лаўжанскім сельсавеце, ні ва ўсім Сіроцінскім раёне.

І ня дзіва таму, што падрыхтоўка да весьнавой сяўбы ў Лаўжанскім сельсавеце ідзе з рук вон дрэнна. Насеннфонды не ссыпаны. Насеньне вядучай

Тав. БЭРЗІН. Член партыі з 1919 году. Рабочы-чыгуначнік (машыніст). З 1919 па 1926 год працаваў у органах ВЧК-ГПУ. З 1926 па 1930 год працаваў старшынёй віцебскага акрсавету прафсаюзаў. З 1930 году — старшынёй Белбюро ЦК чыгуначнікаў. З 1930 член ЦК КП(б)Б і ЦВК БССР, член прэзыдыуму ЦСПСБ. З 1932 году член ЦК саюзу чыгуначнікаў. Зараз назначан начальнікам палітаддзелу Полацкай МТС.

тэхнічнай культуры—ільну-засьпана толькі на 15,2 процанта ільну, бульбы—50 процантаў, вбожкавых—ці 81 процант, як лічыць партячэйка, ці 31,4 процанты—як надрукавана ў раённай газеце. Гэта—ў калгасах. А што ў аднаасобнікаў—дзе там ведаць партячэйцы!

А як-жа коні? Возьмем калгас «Чырвоная лоўжа», на тэрыторыі якога знаходзіцца сам сакратар партячэйкі. Якія тут коні? Вось цэнтр калгасу. Тут стаіць 22 кані, разьбітыя на дзьве групы. Загадчык гаспадаркі Дубаў (партыец) тлумачыць:

— У гэтай стайні 9 слабых коняй, якія ня ходзяць. Яны да таго даведзены, што ледзь-ледзь на ногах стаяць.

У другім аддзяленьні стайні лепшыя коні, але што гэта за лепшыя. З 10 коняй толькі 2-3 працаздольныя, мож на запрагчы ў плуг, астатнія сьбіты.

Заходзім у стайню. У станку кідаецца ў вочы кабыліца, якая ня звольнілася яшчэ ад пасьледу, шукае жарабё. Яго няма: радзіла мёртвага. Конюхаў няма. Ключам вэтфельчара, які ў калгасе працуе загадчыкам СТФ. Пытаемся:

— Таварыш Быкаў, што з кабыліцай, адкуды?

— Нічога: скітула, мабыць ад сілосу,—адказвае «вэтфельчар». І дабаўляе:

— Нічога, злучым яшчэ.

Хіба гэта ня кулацка-шкодніцкія адносіны да сацыялістычнай маемасьці?! А хто такі Быкаў? Высьвятляецца—фэльчар-інвалід, былы кулак, які пастаянна эксплёатаваў батрацкоў. Ці ведае пра гэта партячэйка? Ведае, але церпіць Быкава, церпіць кулацкае шкодніцтва ў калгасе. Быкаў ужо пасьпеў прыказаць не адзін дзесятак сьвіней. І пра гэта ведае партячэйка, але Быкаў прасіў не складаць актаў, уязьдзейнічаў на мяккае сэрца Якгураўа—і ня склалі акту, не аддалі пад суд шкодніка.

Балюча адбілася кулацкае шкодніцтва на карку калгасьніцаў летась. Раскралі з калёў, такоў і сьвіркаў 1.500 пудоў збожжа, калі ня больш. Туга было і з выкананьнем плану ільнозагатовак. Кулацтва ў калгасе дабілося, што ільном затрывалі бульбу ў буртох, а зімой раскрывалі буртох, каб дастаць лён. Зараз падлічваюцца вынікі кулацкага шкодніцтва ў выгляд дзе актаў на памерзлую бульбу.

Засталіся яшчэ і зараз у калгасах кулацкія прыхвасьні. Канкураваць супроць іх ярасьць калгасных мас—задача партячэйкі. Яна гэтага ня можа зрабіць, бо не апіраецца на масы, на калгасны актыў. Працоўная дысцыпліна хісткая, асабліва ў калгасе «Чырвоная лоўжа», дзе кулак прыхаваў сваю руку больш, чым у іншых масцох.

Дык на чым-жа грунтавалася кіраўніцтва РК, калі паказвала на лоўжанскую партячэйку, як на адну з лепшых? Аказваецца, тамтэйшыя выводы рабіліся на групе некалькіх добрых, узорных прыкладаў падрыхтоўкі да сяўбы ў асобных калгасах.

Вось, коні ў калгасе «Шлях да новага жыцьця». Яны—ў баявой гатоўнасьці. І чаму? Калгаснікі, калгасныя конюхі лобоўна адносяцца да коняй. Добра і акуратна кормяць і поюць, чысьцяць, аберагаюць ад пакалеч ваньняў. Калі выехалі на пробны выезд у поле, дык коні проста гарцавалі. Чыстыя, сытныя, ў прывы заплецены істужкі. Зразумела, такі калгас з посьпехам справіцца з сяўбой. Гэты калгас ня толькі сваю работу забясьпечыў цягавай сілай, але змог Чырвонай арміі прадаць 2 коняй.

Гэтыя асобныя добрыя прыклады ні ў якім разе не даюць права сьцьвярджаць, што на адказнейшых вучастках раёну ёсьць вералом у параўнаньні з часам загатовак, летаняй уборкі і асеньняй сяўбы. Наадварот, яны падкрэсьліваюць, што вакол сумных результатаў ранейшых кампаній партыйная маса не мабілізавана і вопыт лепшых, перадавікоў не папулярызуецца. РК КП(б)Б ня ведае становішча ў сваіх ячэйках і прышывае ярлык «лепшых» сусім не таму, каму патрэбна.

Лепшай праграмай наладжаньня работы партячэек зьяўляецца пастанова ЦК УсеКП(б) «Аб рабоце ячэйкі калгасу «Іскра», Сонцаўскага раёну (ЦЧВ) і калгасу «Уперад», Н.-Маскоўскага раёну, Дняпрапятроўскай вобласьці, у сувязі з падрыхтоўкай да весьнавой сяўбы». Гэта пастанова, на жаль, дагэтуль не распрацавана ні ў Лаўжанскай ячэйцы, ні ў лаўжанскіх калгасах і наогул, відзе ў раёне.

А. Мінуцкі.

Пачалі сяўбу і дэмабілізаваліся

КАСЬЦЮКОВІЧЫ. (Наш кар.).

Бальшыцкі сельсавет—адзін з буйнейшых і рапалочых у раёне. На яго тарыторыі ёсьць 16 калгасаў. Сельсавет першы ў раёне пачаў сяўбу, а 4 калгасы («Іскра», «Х зьезд», «13 Басырычнік» і «Камуніст») разгарнулі ўжо масавыя палявыя работы.

Як ня дзіўна, але арганізаваны па чатак сяўбы ў гэтых 4-х калгасах дэмабілізавў бальшыцкую партыйную ячэйку.—«У нас усё падрыхтавана поўнасьцю на 100 проц., застаецца толькі пасеяць», — супакойвае сябе сакратар ячэйкі Мацкевецкі.—«Мы гатовы. Астаноўка толькі за прыродай»,—паўтарае за сакратаром ячэйкі старшыня сельсавету т. Мельнікаў (член партыі).

Што бальшыцкая ячэйка правяла значную работу ў падрыхтоўцы калгасаў да сяўбы, у гэтым сумненьня няма. Створаны вытворчыя брыгады ў большасьці калгасаў, устаноўлены вытворчыя вучасткі, брыгады прымацаваны да поўных вучасткаў, ссыпаны насеньні і страхавыя фонды. Але-ж гэта далёка ня ўсё.

У калгасе імя Молатова калёсы не адрамантаваны, разьбітыя хамуты ў дрэнным становішчы, інвэнтар раскіданы. У калгасе імя Будзённага дзяцвы сіла не падрыхтавана, яна дрэнна даглядаецца. Аддзяленьне Казьніцкага саўгасу забясьпечана рабочай сілай толькі на 50 проц. Дагаворы з калгасамі не заключаны.

Ні ў адным з калгасаў сельсавету не арганізавана сацыябарніцтва, памёк брыгадамі. Ні адзін з калгасаў ня ўступіў у спаборніцтва з другім. Адозва ўсесаюзнага і ўсебеларускага зьездаў калгасьнікаў-ударнікаў, прамова т. Сталіна па ўсесаюзным зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў не ва ўсіх калгасах і брыгадах прапрацаваны.

У брыгадах не арганізавана выдань не насьценгазэт. Не вядзецца работы з рабселькорамі. У калгасах пасьцешныя газэты выдаюцца па-старым зны чаі—ад сьвята да сьвята.

Найбольш адсталы вучастак—аднаасобны сэктар. Аднаасобнікі да сяўбы не падрыхтаваліся. Ня ссыпаны насеньні і страхавыя фонды. 5 заможна-кулацкіх гаспадарак яўна сабатуюць выкананьне плянаў весьнавой сяўбы, а да іх яшчэ ніякіх мер не прынята.

З гэтых фактаў ясна відаць, што астаноўка не за «прыродай», а за арганізацыяй партыйна-масавай работы ячэйкі.

Наступаюць гарачыя дні сяўбы. А Бальшыцкая ячэйка на гэтыя баявыя і адказныя дні нават пляну сваёй работы ня мае, ня ведае свайго актыву. У ячэйцы невядома, колькі па сельсавеце калгасьнікаў-ударнікаў, бо з імі не вядзецца ніякай работы.

Вось прыклад бясплянавай работы. 7 красавіка скліканецца партыйны сход. На ён толькі члены ячэйкі, але і сам сакратар ячэйкі да сямнаці пачат ку сходу ня ведаў, аб чым будуць гаварыць на партыйным сходзе. Толь кі тут, на сходзе пачалі думаць, лічэ пастаўіць пытаньні, тут-жа вылучы лі дакладчыка. Зусім зразумела якасьць такога партсходу. Сход адкры ты, але праводзіцца ў канцылярыі сельсавету, куды рэдка хто з калгась нікаў заглядвае. А радам у калгасе «Ільліч» сабраліся калгаснікі і сярод іх вядзецца работа кулацкімі «агітпропамі».

Тав. ВАСКОВІЧ. Член партыі з 1917 году. З 1919 па 1927 год служыў у Чырвонай арміі раздзым чырвонаармейцам, сакратаром парткалектыву палка, ваенкомам палка, інструктарам падзіву, начальнікам пасэкра, старшым інструктарам пуокра. З 1927 году працаваў адказным інструктарам ЦК КП(б)Б. Зараз назначан начальнікам палітаддзелу Заслаўскай МТС.

Ячэйка зусім не перабудавала сваёй работы. У калгасных брыгадах партыйная работа не праводзіцца. Прымацаваныя камуністы да калгасаў мала ведаюць аб унутраным жыцьці калгасаў і ў калгаснай вытворчасьці ня прымаюць удзелу.

Пачатак сяўбы патрэбуе канкрэтнай, выразнай пастановкі работы, апэратыўнага кіраўніцтва кожным вучасткам, кожнай калгаснай брыгадай. Правільна расставіць сілы, ведаць свой актыў, наблізіць партыйную работу да шырокіх мас, пазбавіцца з бальшавіцкай настойлівасьцю змагацца за ажыцьцяўленьне пістарычнай прамовы т. Сталіна аб рабоце на вёсцы—вось праграма для работы бяльшыцкай партыйнай ячэйкі.

Ц. Дзе...

БРЫГАДНАЯ ГІГАНТОМАНІЯ

РАГАЧОЎ, 13.

У пасобных калгасах раёну груба скажаюцца дырэктывы аб арганізацыі пастаянных вытворчых брыгад. Ёсьць выпадкі арганізацыі своеасаблівых брыгад-гігантаў. Праўленьне калгасу імя Варашылава, напрыклад, залічала ў палявочныя брыгады па... 120 чал. Адно вызнана ў такіх брыгадах налічвае па 40 і больш чалавек. Характэрна, што пятыя брыгады зацьверджаны МТС. Трэба пераканацца спыніць брыгадную гігантаманію і выпраўіць памылкі.

І. Каждан

ЯЧЭЙКА У КАЛГАСЕ

Студзеньскі пленум ЦК УсеКП(б) і прамова тав. Сталіна на гэтым пленуме аб рабоце на вёсцы далі шырокую праграму работы для ўсіх партыйных арганізацый гораду і вёскі. Асноўная задача партыі на вёсцы—зрабіць усе калгасы бальшавіцкімі, высока рэнтабельнымі—патрабуе карэннай перабудовы работы ў духу ўказаньняў тав. Сталіна. Зьмест гэтай перабудовы заключаецца ў тым, што «партыя ўсю яе моцка цяпер абмяркоўваецца асобныя ініцыятывы ўмяшаньня ў працэс сельска-гаспадарчага разьвіцьця. Яна павінна цяпер узяць у свае рукі кіраўніцтва калгасамі, прыняць на сябе адказнасьць за працу і дапамогчы калгасьнікам весьці сваю гаспадарку наперад, на аснове даных навукі і тэхнікі». **(Сталін).**

Пытаньне кіраўніцтва—гэта стрыжневое пытаньне. Ад якасьці кіраўніцтва залежыць посьпех калгаснай вытворчасьці. Зусім пэдаўна ЦК УсеКП(б) гэта прайлюстраваў на вопыце дзьвёх ячэек—ячэйкі калгасу «Іскра» (ЦЧВ) і ячэйкі калгасу «Уперад» (Дняпрапятроўская вобласьць). У пастанове аб гэтых ячэйках ЦК УсеКП(б) сфармуляваў зусім выразна формы і мэтады кіраўніцтва калгасным жыцьцём. Мы ў нашым артыкуле на канкрэтным матэрыяле дзьвёх ячэек пастараемся паказаць яе калкарнае значэньне маюць гэтыя ўказаньні ЦК для таго, каб скарэйшы ўмацаваць і ўзьняць на вышэйшую ступень галіны калгасы.

Возьмем ячэйку калгасу «Пралетарый», Катыльскага раёну. Гэты калгас арганізаваўся ў 1928 г. і складаецца з 80 гаспадарак. Значная колькасьць калгаснікаў — дэмабілізаваныя чырвонаармейцы. На працагу ўсяго часу існаваньня калгасу яму аказваецца ўсямерная дзяржаўная дапамога.

У гэтым калгасе ёсьць усе ўмовы для разгортваньня шырокай партыйнай работы. Аднак, мы гэтага ня бачым. Партыйная ячэйка, якая складаецца з 7 членаў і 8 кандыдатаў, зусім не вядзе барацьбы за арганізацыйна-гаспадарчае і палітычнае ўмацаваньне калгасу.

Калгас павінен быў ждаць дзяржаве 20 цэнтн. ільну, зпаў усяго толькі 3 цэнтн. У часе малацьбы стрэты па абожжавых культурах дахадзілі да 5 пуд. у дзень. Больш 300 пудоў бульбы гніло і больш 2.500 пуд. бульбы разбазарана.

Замест таго, каб па-бальшавіцку рэагаваць на факты безгаспадарчасьці, замест таго, каб весьці барацьбу за строгі ўлік, замест таго, каб арганізаваць барацьбу з лодырамі, растлумачваць калгасьнікам пастановы III сэсіі ПВК СССР,—ячэйка ўсё запісвала ў сваіх пастановах: «Прыняць меры па гаспадарчым укацаваньні калгасу».

Дэкларацыйнасьцю прыпрыкмецца бязьдзейнасьць, бясклопатнасьць. Яркіх фактам бязьдзейнасьці выяўляецца тое, што калгас, маючы найлепшую глебу ў Катыльскім раёне, дае ніжайшую ўраджайнасьць у параўнаньні з іншымі калгасамі раёну. Гэта тлумачыцца тым, што ячэйка сусім не займалася пытаньнямі павышэньня ўраджайнасьці, не змагаецца за ўкараненьне агранамічнуму.

Ячэйка нічога не зрабіла і ў адносінах падрыхтоўкі да весьнавой сяўбы. Больш паловы гною яшчэ ня вывезена ў поле, адстаўнічае надзелны поле коняй. Пастанова аб абмеркаваньні чыстцы коняй увогуле не абмеркавана на толькі беспартыйных, але і камуністах тав. Прахаренка. Бюро ячэйкі ніякіх мер у адносінах да Прахаренка не прымала. У стайнях брудна, ня ўсіх коняй водзяць на водапой, ня ўсім конным падсыпаецца корм. Гэтыя акалічнасьці вытвараюцца ня гледзячы на тое, што ў кожнай палявочнай брыгадзе ёсьць 3-4 камуністы.

Пастанова ЦК УсеКП(б) ад 22 сакавіка аб дзьвёх ячэйках абавязала ячэйкі пастаўіць сваю работу так, каб кожны камуніст, «паказваў узоры ў працы, уплываў на ўсе дзелы справы, быў байцом-арганізатарам, згуртоўваючым вакол ячэйкі актыў і калгасныя масы ў барацьбе за посьпех сяўбы і гаспадарчае ўкацаваньне калгасу, супроць кулака, лодыря, рвача, прагулышчыка».

У калгасе «Пралетарый» мы нагледзем жвраз адваротнае. Камуністы Прахаренка, Еўсюк, Баранцоў і інш. пасьля абеду прыходзяць на работу пазьней усіх. Гледячы на іх, іншыя калгасьнікі сусім не выходзяць на работу. Камуніст Еўсюк дрэнна працуе на стайні, камуніст Прахаренка ініцыятыву і бязьдзейна адносіўся, будучы загадчыкам СТФ.

У значнай частцы камуністаў колькасьць працадзён значна меншая чым, у перасьвых беспартыйных калгаснікаў. Так, напрыклад, за два месяцы член партыі Тарасевіч меў 34,2 працадня, беспартыйны Шыманскі—49,5, кандыдат партыі Каліновіч—46,4, беспартыйны Трэпскі—66,2 працадня. Такіх фактаў пімат у гэтым калгасе.

І пры ўсім гэтым ня было ніводнага выпадку, каб ячэйка абмеркавала пытаньне аб прагулах таго ці іншага камуніста і пастаніла пытаньне аб барацьбе з прагуламі наогул.

Партыйна-масавая работа ў ячэйцы ў поўным загоне. Ня гледзячы на поўнасьць ячэйкі ніякімі мерамі ў брыгадах партыйныя групы і партыйных арганізатараў, ячэйка гэтага не зрабіла. Зусім зразумела, што пры такой пастаноўцы работы на месца быць і гутаркі аб забесьпячэньні арганізуючага ўплыву ячэйкі на рапалочых вучастках вытворчасьці.

Пры поўнай адсутнасьці якой бы там ні было партыйна-выхоўчай работы, у ячэйцы нават не прапрацавалі апошнія рашэньні партыі. Ячэйка нават не пакланацілася аб тым, каб кожная брыгада прапрацавала плян палявых работ.

Ячэйка адарвана ад пасобных камуністаў, не кантралюе іх, а асобныя камуністы ў результаце гэтага адрываюцца ад ячэйкі. Так, напрыклад, камуністка **Тарасевіч,** былая батрачка, атрымала некалькі разоў спагнаньні, але пасьля гэтага ніхто на яе ўвагі не зьвяртае, ніхто ёй не дапамагае. Ёй не дапаматлі ўстроіць дзіцё ў ясьлях, і ў результаце яна спынила выхад на работу і паступова адрываецца ад партыі.

Тав. **Баранцоў**—кандыдат партыі з 1931 г., нагрузкі ніякай ня мае, на вытворчасьці напрыкладны, ячэйка ім не займаецца. У результаце—адрываецца ад партыі. Такое-ж становішча з камуністамі **Канюшко, Каліновец, Сазаноўіч, Сытнік** і інш.

У калгасе ёсьць аддзяньне, перадавыя калгаснікі, ёсьць рад добрых і вопытных брыгадзіраў, але ячэйка ім ніякай дапамогі не аказвае, работы з імі не вядзе. Сакратар ячэйкі **Ламакін** замест таго, каб згуртаваць камуністаў, стварыць моцнае ядро беспартыйнага актыву, гны га, скарэйчыся на дзяжасьць работы. Райком партыі мала дапамагае ячэйцы. Прымацаваныя да ячэйкі раённыя работнікі т. т. Дзіроко і Прокаеа нічога ня робяць, не дапамагаюць ячэйцы ў падрыхтоўцы да сяўбы.

З боку пасобных калгаснікаў ёсьць заявы аб засьмечанасьці калгасу. Ячэйка ў адносінах выяўленьня клясава-чужых элемэнтаў сыстэматычнай работы не праводзіць. Гэта гаворыць аб тым, што, паміма ўсяго іншага, у ячэйцы адсутнічае клясавая пільнасьць.

***

Зусім іншае становішча ў ячэйцы калгасу імя Сталіна, Слуцкага раёну. Гэты калгас арганізаван у 1931 г. і налічвае ўсяго 52 двары. За 2 гады свайго існаваньня калгас умацаваўся і даб'ўся значнага павышэньня ўраджайнасьці. Партыйная ячэйка калгасу складаецца з 6 чалавек, з іх 5 працуюць непасрэдна на вытворчасьці—у калгасе.

Партыйная ячэйка вяла і працягвае весьці ўпартую барацьбу за павышэньне ўраджайнасьці. У калгасе функцыянуе шгодзенная вечарняя агратэхнічная школа, у якой навучаецца 70 чалавек калгаснага актыву. Кошт працадня ў параўнаньні з 1931 годам павысіўся амаль ў тры разы, у той час, калі норамы выпрацоўкі выпэй сярэдніх норм іншых калгасаў Слуцкага раёну. Гэта результат таго, што валавы даход калгасу значна ўзрос.

Партыйная ячэйка калгасу, абагачаная вопытам партыйна-масавай работы ў порыд загатовак (калгас і ўвесь Урэчыцкі сельсавет першы ў раёне выканаў плян дзяржаўных загатовак, без дапамогі раённых упаўнаважаных), своячасова пераключылася на падрыхтоўку да сяўбы. У калгасе ёсьць 2 палявочныя брыгады—адна буйнейшая і з аднае сьцяновачкі. Брыгады арганізацыйна афармлены, закладна размеркаваны абавязкі. Брыгадам поўнасьцю адведзены вучасткі зямлі. Калгас у цэлым мае вытворчы плян, які ўстанаўляе шасьць цэлыны севазвароты. Пры дапамозе ячэйкі і пад яе кіраўніцтвам калгас поўнасьцю падрыхтаваўся да сяўбы. Поўнасьцю, і нават з некаторымі лішкамі, ссыпалі насеньне, адрамантавалі інвэнтар, у поўнай меры падрыхтавалі да палявых работ коняй.

Увесь склад партыйнай ячэйкі расстаўлен на адказных вучастках калгаснай вытворчасьці: 1 на СТФ, 2 у палявочных брыгадах, 1 у буйнейшай брыгадзе. Брыгадзіры, загадчык СТФ, кладаўшчыкі і конюхі зьяўляюцца актыўнымі і праверанымі па рабоце калгаснікамі.

Дасягненьні ячэйкі бясспрэчныя. Але разам з гэтым, ячэйка за апошнія два месяцы ня ў сваёй рабоце рад недахопаў. Грунтоўнай прычынай гэтых недахопаў выяўляецца тое, што паміж калгаснай і сельсавецкай ячэйкамі сьперліся межы, што сакратаром першай і другой ячэек зьяўляецца адзін і той жа чалавек (загадчык сямігодкай тав. Карпун вытрыманы і аўтарытэтны работнік).

За апошнія два месяцы ўсе пытаньні калгасу імя Сталіна вырашаліся сельсавецкай ячэйкай і таму калгасная ячэйка была адсунута ад непасрэднага кіраўніцтва калгаснымі жыцьцём. Ячэйка калгасу імя Сталіна, маючая моцны партактыў з партыйнымі арганізатарамі ў брыгадах, за апошні час не выбраецца, не абмеркавала ніводнага пытаньня калгаснага жыцьця. Сельсавецкая-ж ячэйка, абслугоўваючая 9 калгасаў, зусім зразумела, не ў стане ахапіць усе пытаньні калгасу імя Сталіна.

Становішча зараз такое, што ячэйка фактычна пераварылася ў партыйную групу, без пастаяннага кіраўніка. Сакратар ячэйкі тав. Карпун проста заяўляе: «Займацца мне толькі пытаньнямі свайго калгасу—гэта значыць забыць усе астатнія калгасы вышага сельсавету».

Пры такім становішча партыйна-масавая работа калгасу імя Сталіна аслабла. Той беспартыйны актыў, які спрыяваў вакол ячэйкі ў порыд абожжазагатовак, не замацаван і яго скарыстан для работы сярод аднаасобнікаў у порыд падрыхтоўкі да сяўбы. Цэнтр цяжару масавай работы не перанесен у брыгады і таму ня ўсе пытаньні даходзяць да калгаснікаў. Сацыябарніцтва і ўдарніцтва не разгорнута ні ў калгасе, ні ў брыгадах.

Трэба проста сказаць, што вялікую частку віны за пасьлабленьне работы калгасу імя Сталіна нясе Слуцкі райком КП(б)Б, які, маючы па ўсім раёне ўсяго толькі адну калгасную ячэйку, ня здолеў арганізацыйна замацаваць яе.

Слуцкі райком КП(б)Б не ўлічыў, па-першае, таго, што гэта ячэйка мае значны вопыт работы і дабілася ўмацаваньня калгасу і таму мэта стаць апорай калгаснай ячэйкай. Райком не ўлічыў, па-другое, таго, што самастойнае існаваньне гэтай калгаснай ячэйкі разьвіла яшчэ і таму, што, маючы ў сваім пасьлядніцкім пункце 100 аднаасобных гаспадарак, зьяўляецца апорай для разгортваньня масава-палітычнай работы сярод працоўных аднаасобнікаў.

Слуцкі райком павінен прыняць усе меры да таго, каб арганізацыйна ўмацаваць і замацаваць ячэйку калгасу імя Сталіна, якая у порыд загатовак і ў першы порыд падрыхтоўкі да сяўбы дазвала сваю жыцьцядольнасьць і баяздольнасьць.

***

На прыкладзе ячэйкі калгасу імя Сталіна мы бачым, што нават пры поўных недахопах канкрэтнае партыйнае кіраўніцтва зьяўляецца рапалочым вагаром за ўмацаваньні калгасаў, у падпяцьці матар'яльнага дабрабыту калгаснікаў.

Там, дзе вытворчыя ініцыятывы ня сталі асноўным зьместам партыйнай работы,—як мы гэта бачым на прыкладзе ячэйкі калгасу «Пралетарый»,—дык нават пры добрых аб'ектыўных умовах, працы наміцчы.

«Калгасы... могуць паказаць цуды гаспадарчага будаўніцтва, калі на чале іх стаяць сапраўдныя рэвалюцыянеры, бальшавікі, камуністы». Гэтыя словы т. Сталіна павінны ўспомніць усе партыйныя ячэйкі асабліва зараз, пасьля разгорнутага весьнавога сяўбы пазнага году другой пяцігодкі. Без гэтага сяўба гэтага году будзе балазой праверкай для ўсіх калгасаў, але ўсіх партыйных ячэек, для кожнага камуніста ў асобнасьці.

„Аўстрыя павінна цесна супрацоўнічаць з Германіяй“

Заявы германскай газэты

БЭРЛІН, 12. Блізкі да германскага ўраду орган «Таткрэйз» прысьвячае артыкул унутрыпалітычнаму становішчу Аўстрыі, у прыватнасьці, пытаньню аб «угледненьні ўрадовага рэжыму ў Аўстрыі са становішчам, якое стварылася ў Германіі». Як вядома, у Аўстрыі нацыянал-сацыялісты і штырыйскія арганізацыі фашысцкага хэймвэру ўзмацняюць сваю агітацыю супроць ураду Дольфуса, абвінавачваючы яго ў сабатажы «аншлюсу» і ў патураньні габсбургкім манархісцкім плянам, пляхам ужываньня дык татарскіх мэтадаў кіраваньня дзяржавай. Пасьлядоўнае слоў «Таткрэйз», лёс ураду Дольфуса, які карыстаўся ў парляманце большасьцю толькі аднаго голасу, у сучасны момант залежыць ад далейшага падтрыманьня з боку 6 хэймвэраўскіх дэпутатаў, якімі кіруе **Штарэмбэрг**. «Таткрэйз» канстатуе, што **Штарэмбэрг**, які падтрымлівае ўрад Дольфуса, ня мае ў Германіі ніякай апоры, апрача слабога падтрыманьня з боку віцэ-канцлера **Папэна**. Што датычыць пазыцыі германскага «Сталёвага шлему», дык гэта арганізацыя займала ў адносінах аўстрыйскага хэймвэру кістальную пазыцыю пад упливам былога начальніка штабу хэймвэраўскіх арганізацый маёра **Пабста**, даверанай асобы Штарэмбэрга. (Пабст, які зьяўляецца адным з забойцаў Розы Люксэмбург, высланы з Аўстрыі два гады таму назад за падрыхтоўку путчу, пражывае ў сучасны момант у Германіі, дзе ён служыць зьвязваючым зьвяном паміж «Сталёвым шлемам» і хэймвэрам). «Таткрэйз» далей указвае: «Уплыў **Пабста і Штарэмбэрга** ў колах «Сталёвага шлему» за апошні час значна аслаб, бо Штарэмбэрг вядзе ў сучасны момант палітыку, якая ідзе ў разрэз з палітыкай германскага ўраду». «Таткрэйз» сьцьвярджае далей, што ўплыў хэймвэраўскай арганізацыі ў самой Аўстрыі таксама паменшыўся і, у той-жа час, моцна павялічваецца ўплыў штырыйскіх арганізацый хэймвэру, зьвязаных з коламі германскай цяжкай прамысловасьці. Па думцы «Таткрэйз», ва ўнутрыпалітычным становішчы Аўстрыі наступіць пералом у бок «угледненьня» аўстрыйскага рэжыму са становішчам у Германіі, у той момант, калі разгалосьсі ўнутры хэймвэру будуць зьліквідаваны ў выніку перамогі пан-германскага курсу, г. зн. цясьнейшага супрацоўніцтва з германскім урадам.

* * *

РЫМ, 13. Сёньня прыляцеў у Рым аўстрыйскі канцлер **Дольфус**. Ён наведае **Мусаліні**, а таксама спаткаецца з **Папэнам і Герынгам**. Перадаюць, што Дольфус будзе таксама абмяркоўваць пытаньне аб заключэньні згоды з Ватыканам. **Мусаліні** прыняў **Герынга**, а потым германскага пасла ў Рыме—**Хасфэля**.

АНТЫГЕРМАНСКІЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ У ПОЛЬШЧЫ

Віленская прэса паведамляе, што па ўсіх буйнейшых гарадох Польшчы прадаўжаюць адбывацца антыгерманскія дэманстрацыі.

У **Познані** адбылася вялікая антыгерманская дэманстрацыя. Па дарозе дэманстранты забралі ў кіёсках літаратуру, якую зараз-жа зьнішчалі, а таксама зрывалі нямецкія шыльды. 10 красавіка адбылася дэманстрацыя моладзі на плошчы Волі, дзе дэманстранты спалілі вялікую колькасьць нямецкай літаратуры.

У **Катавіцах** 11 красавіка вучнёўская моладзь наладзіла антыгерманскі мітынг, на якім прысутнічала некалькі тысяч чалавек. Прамоўцы выказваліся супроць нямецкіх гвалтаў над польскім насельніцтвам у Сілезіі. У канцы мітынгу была прынята рэзалюцыя пратэсту супроць прасьледваньня польскага насельніцтва ў Германіі, пасьля чаго была наладжана дэманстрацыя, якая прайшла па галоўных вуліцах гораду. Дэманстранты па дарозе выбілі некалькі шыб у нямецкіх магазынах.

10 красавіка ў **Лодзі** выйшаў экстраны дадатак да нямецкай газэты «Фрэйе прэсэ», рэдакцыя якой была разгромлена антыгерманскай дэманстрацыяй. Рэдакцыя газэты «Фрэйе прэсэ» піша, «што «для немцаў у Польшчы прыйшоў час цяжкай спробы». Рэдакцыя, друкарня і адміністрацыя газэты «Фрэйе прэсэ», а таксама нямецкая бібліятэка, зьнішчаны. — «Тое, што створана шматгадовай цяжкай працай,—піша газэта,—зьнішчана на працягу адной гадзіны, пакуль паліцыя не разагнала дэманстрантаў.

Лейбарысты прапануюць прадоўжыць гандлёвы дагавор з СССР

ЛЁНДАН, 12. Паводле паведамленьня агэнцтва **«Рэйтар»**, члены апошняга лейбарысцкага габінэту, за выключэньнем увайшоўшых у нацыянальны ўрад, зьвярнуліся да Макдональда з прапановай прадоўжыць на тры месяцы тэрмін існуючага гандлёвага дагавору з СССР. Аўтар звароту ўказвае, што часовае адтэрмінаваньне дазволіла-б, па-першае, заключыць новы дагавор у больш прыязнай атмасфэры, па-другое, даказаць жаданьне народу падтрымліваць прыяцельскія адносіны з СССР, па-трэцяе, аказаць вялікую ўслугу арыштаваным у СССР ангельцам.

Пралетарыят Эўропы рыхтуецца да антыфашысцкага кангрэсу

ГІШПАНІЯ. У КІНТСПОРДЗІ-ОРДЭН (Кастылія) адбыўся антыфашысцкі камуністычны мітынг, на які сабралася больш 4.000 сялян з усёй акругі, у тым ліку шмат сялянак. На мітынгу выступіў з прамовай камуністычны дэпутат Картэсаў Бальбонтын. Выбраны дэлегаты на эўрапэйскі антыфашысцкі кангрэс. Прынята аднагалосна рэзалюцыя пратэсту супроць фашысцкага тэрору ў Германіі.

* * *

ФРАНЦЫЯ. У Парыжы адбыўся прох тысячны антываенны мітынг рабочых і служачых камунальных прадпрыемстваў. На мітынгу выбраны 5 дэлегатаў на эўрапэйскі антыфашысцкі кангрэс.

* * *

ПРАГА, 8. Чэха-славацкі міністар унутраных спраў адмовіўся выдаць дазвол на правядзеньне ў Празе эўрапэйскага антыфашысцкага кангрэсу. У Чэха-Славакіі забаронены таксама антыфашысцкія сходы рабочых.

* * *

Паводле вестак арганізацыйнага камітэту антыфашысцкага кангрэсу, РУХ СУПРОЦЬ ФАШЫЗМУ ПАШЫРАЕЦЦА ПА ЎСЁЙ ЭЎРОПЕ. З ЧЭХА-СЛАВАКІІ, ФРАНЦЫІ, АНГЛІІ, БЭЛЬГІІ, ГАЛЯНДЫІ, АЎСТРЫІ, ПОЛЬШЧЫ, ІТАЛІІ, ФІНЛЯНДЫІ і іншых краін паведамляюць аб далучэньні да кангрэсу шырокіх мас працоўных, якія выбіраюць сваіх дэлегатаў на кангрэс.

Ня гледзячы на тое, што сацыял-дэмакратычныя кіраўнікі сабатуюць кангрэс, сярод выбраных дэлегатаў ёсьць шмат сацыял-дэмакратычных рабочых. Камуністычныя газэты паведамляюць таксама аб росьце антыфашысцкага руху ў скандынаўскіх краінах і аб узмоцненай падрыхтоўцы да кангрэсу ў КАПЭНГАГЕНЕ.

ВАЛ. МЯДЗЬВЕДЗЕЎ

„ВЕРХ ДАЛІКАТНАСЬЦІ“

(ПА ЯПОНСКІ)

Японскія бамбавозы бамбардыравалі амэрыканскае консульства ў Кітаі. Праз некалькі дзён японскі ўрад прасіў прабачэньня ў Амэрыкі за «памылку».



Узмацненьне антыяпонскага байкоту

ТОКІЁ, 10. Ханькоўскі карэспандэнт газэты «Ніці-ніці» указвае на надзвычайнае ўзмацненьне антыяпонскага байкоту ў раёне **Уханя**. Гандлёвыя зьвязкі паміж кітайскімі і японскімі коламі зусім спыніліся. Паводле слоў карэспандэнта, у адным толькі горадзе **Учане** японскія фірмы маюць непраданых запасаў японскіх тавараў на 10 млн. таэлій і церпяць вялікія страты, у сувязі з аплатай страхавых і складзкіх расходаў.

У ціскох вострага эканамічнага крызісу

ПАЗШ. Статыстычныя даныя за сакавік паказваюць далейшае пагоршаньне эканамічнага становішча. Выраб аўтамабіляў складае 81.000 супроць 93.000 у лютым. Вытворчасьць сталі панізілася да 867.000 тон супроць 1.043.000 тон у лютым. Вытворчасьць чыгуну панізілася на 11 проц., будаўніцтва — на 7 проц. З затушэньнем доменных печаў колькасьць яшчэ функцыянуючых скарацілася да 38. У 1929 годзе дзейнічала больш 200 домен. Паведамляюць, што абмяркоўваецца пытаньне аб поўным спыненьні работ на медзяных рудніках ПАЗШ.

У сувязі з тым, што эканамічнае становішча не выяўляе адзнак паляпшэньня, патрабаваньне інфляцыі раздаецца ўсё мацней і больш настойлівей. 300 прадстаўнікоў буйнай прамысловасьці і гандлю апублікавалі заяўленьне, патрабуючы інфляцыі, у прыватнасьці, памяншэньня забесьпячэньня даляра золатам. Біржавікі спэкулююць на інфляцыйных чаканьнях адных і на апасы перад інфляцыяй другіх, і зноў падымаюць цэны на тавары.

Паводле даных «Нэйшэнэль індастрыял Канфірэнзборд» (статыстычнай арганізацыі амэрыканскай прамысловасьці), сума выплачанай у ПАЗШ зарплаты зьменшылася да пачатку сакавіка гэтага году на 66 проц. у параўнаньні з 1929 годам і складае толькі трэцюю частку пераадкрыўсінай зарплаты. Рэальная заработная плата скарацілася на 54 проц.

* * *

ФРАНЦЫЯ. Паводле даных абсьледваньня інспэктаратаў працы, якое ахапляе прадпрыемствы з колькасьцю рабочых звыш 100 чалавек, частковае беспрацоўе ў Францыі значна вырасла. Колькасьць рабочых, занятых менш 48 гадзін у тыдзень у мэталюргіі дасягае 47 проц., супроць 33,5 проц. год складае суму ў мінулага году. У мэталяапрацоўчай прамысловасьці процант часткова беспрацоўных падняўся з 39,7 да 57,3. У тэкстыльнай прамысловасьці процант часткова беспрацоўных дасягае зараз 60. У гумавой, папяровай і картаннай — 70 проц., у харчовай прамысловасьці — 73 проц., у хэмічнай прамысловасьці — 75 проц., у здабываючай прамысловасьці — 76 проц.

Паступленьні французкіх чыгунак за першыя дзесяць тыдняў бягучага году зьменшыліся на 126.522.000 франкаў, гэта значыць на 6 проц., параўнальна з адпаведным пэрыядам мінулага году.

Грузазварот за першыя 2½ месяцы бягучага году таксама скараціўся амаль на 50 проц., або звыш чым на 180.000 вагонаў параўнальна з адпаведным пэрыядам мінулага году.

* * *

ЯПОНІЯ. Паводле даных японскага банку, у сакавіку па-ранейшаму ішло зьніжэньне оптовых цэн. Індэкс оптовых цэн у сакавіку стаў на ўзроўні 177,4 супроць 179,6 у лютым. Больш за ўсё зьнізіліся цэны на рыс і шоўк (сырэц).

У лютым выраб бавоўняных тканін скараціўся на 15 проц. супроць студзеня. Чакаецца далейшае скарачэньне вытворчасьці.

Старшыня асацыяцыі японскіх тэкстыльных фабрыкантаў у Шанхаі ФУНАЦУ, у інтэрв'ю заявіў, што, з прычыны кітайскага байкоту, рынак далёкіх Янцзы фактычна страчан для японскіх тавараў; японскія тэкстыльныя прадпрыемствы ў Кітаі скарацілі вытворчасьць на 10—20 проц.

* * *

ГІШПАНІЯ. Апублікаваны лічбы заможнага гандлю Гішпаніі за 1932 год. Экспарт за гэты пэрыяд складае суму ў 738 млн. пэзэт супроць імпарту, які складае суму ў 974 млн. Дэфіцыт разьвіксвага балянсу ў 1931 г. склаў суму ў 214 млн. пэзэт, а ў 1932 г. — у 236 млн. Агульны зварот па заможным гандлі за 1932 год складае суму ў 1.712 млн. пэзэт, г. зн. з памяншэньнем на 422 млн. супроць адпаведных лічбаў за мінулы год.

Клясавая барацьба ў капіталістычных краінах

АНГЛІЯ. На далатковых выбарах у акрузе Рондда камуніст Гарнэр атрымаў 11.228 галасоў, Мэйнэрдрыат (рабочая партыя)—14.127 галасоў і Томас (лібэрал)—7.851 голас.

У паўднёва-ўсходняй частцы Лёндану па памяшканьня фашысцкай арганізацыі адбылася сутычка паміж рабочымі і фашыстамі.

Некалькі сот рабочых, сабраўшыся па будынку гэтай арганізацыі, разьбілі каменьнямі вокны ў памяшканьні і далі фашыстам сапраўдны бой. Конная паліцыя разагнала дэманстрантаў.

* * *

БЭЛЬГІЯ. Кампартыя Бэльгіі і бэльгійскі камітэт беспрацоўных арганізавалі 28 сакавіка галодны паход на Брусэль.

Буржуазія мабілізавала ўсе сілы паліцыі, каб перашкодзіць «галоднай дэманстрацыі».

Ня гледзячы на ўсе репрэсіўныя меры, калёны рабочых накіраваліся на плошчу Дэ Брукэр, дзе яны выступілі з патрабаваньнем хлеба і работы. У дэманстрацыі прымалі ўдзел рабочыя многіх прамысловых цэнтраў Бэльгіі. Усе выхады са сталіцы былі заняты значнымі атрадамі паліцыі і войск. Тым ня менш рабочым удалося правесьці дэманстрацыі ў розных частках гораду.

Паміж паліцыяй і рабочымі адбылася сутычка і толькі ўвечары паліцыі ўдалося ўстанавіць парадак.

* * *

ПАЗШ. Галодны паход беспрацоўных са Спрынгфільду ў Іллінойск, у якім прымала ўдзел 1.100 чалавек, падпаў пакаду паліцыі. Паліцыя атакавала ўдзельнікаў паходу сьлёзатачывымі бомбамі, зьбіла іх дубінкамі, арыштавала 11 чалавек:

* * *

БАЎГАРЫЯ. На нарадзе баўгарскіх урадавых партый прынята прапанова ўраду аб апулываньні парляманцкіх мандатаў рабочай партыі. Гета прапанова ва ніўбіна быць прадстаўлена ў бліжэйшыя дні на зацьвярджэньне парляманту. Парляманцкая фракцыя рабочай партыі заклікае рабочых да акту пратэсту, аж да ўсеагульнай забастоўкі. Пазаўчора на некалькіх прадпрыемствах у Сафіі была праведзена гадзінная забастоўка пратэсту, у якой прымала ўдзел 2.200 рабочых.

* * *

КІТАЙ. Сялянскія хвалываньні ў правінцыі Чжэцзян у сувязі з прывозам імпартнага шаўкавітнага чарвя зноў узмацніліся. У Юмано каля тысячы сялян арганізавалі дэманстрацыю. Паліцыя адкрыла агонь па дэманстрантах, параніўшы 5 сялян. Натоўп сялян спагналі некалькі гадавальнікаў шаўкавітнага чарвя. У суседніх раёнах, дзе сяляне палюць гадавальнікі імпартнага чарвя, адбываюцца сур'ёзныя сутычкі з паліцыяй.

* * *

ТУРЦЫЯ. Забастоўка рабочых джутавых фабрык у раёне Калькуты (Індыя), якая цягнулася паўтара месяца і ахапіла звыш 8.000 рабочых, скончылася перамогай баставых.

* * *

Студэнцкая канфэрэнцыя дэлегатаў 16 каледжаў, прадстаўляўшая звыш тысячы студэнтаў, парашыла арганізаваць фэдэрацыю студэнцкіх таварыстваў для каардынаваньня барацьбы супроць мілітарызацыі і фашысцкай рэакцыі ва ўнівэрсытэтах, супроць палітыкі эканоміі ў галіне асьветы і супроць абмежаваньня студэнцкіх свабод. У паведамленьні канфэрэнцыі ўказваецца, што студэнты могуць змагацца супроць гэтых небясьпек толькі пры ўмове супольнай барацьбы з рабочымі. Выбраны дэлегаты на антыфашысцкі кангрэс.

Гвалтоўка палітзьняволеных у Бухарэсьце

ВЕНА, 6. Як паведамляюць з Бухарэсту, 180 чыгуначнікаў, якія арыштаваны ў часе барыкадных баёў у бухарэсцкіх чыгуначных майстэрнях і знаходзяцца ў сучасны момант у турме бухарэсцкай пракуратуры, абвясьцілі галадоўку ў знак пратэсту супроць сьвярскага турэмнага рэжыму. Зьняволеныя патрабуюць неадкладнага вызваленьня ўсіх арыштаваных у зьвязку з баёмі. Апрача гэтых 180 рабочых, у турме другога амэрыканскага корпусу знаходзіцца яшчэ 500 чыгуначнікаў—удзельнікаў барыкадных баёў.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Фонд рацыяналізатарскіх прапаноў імя 1 мая

Перадавыя фабрыкі і заводы Менску ў парадку падрыхтоўкі да першамайскага сьвята арганізуюць новыя ўдарныя брыгады, узмацняюць барацьбу за выкананьне пляну 1933 году і асваеньне тэхнікі.

Рабочыя чырвонасьцяжнага заводу ІМЯ ВАРАШЫЛАВА абвясьцілі ЗБОР РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКІХ ПРАПАНОЎ У ФОНД ІМЯ 1 МАЯ. Склікаецца агульназаводская канфэрэнцыя вынаходцаў.

На заводзе «Камунар» праводзіцца ўнутрызаводзкі конкурс паміж цэхамі на датэрміновае выкананьне прамфінпляну.

Цэхі, якія дадуць лепшыя колькасныя і якасныя паказальнікі ў выкананьні прамфінпляну, возьмуць першую кашэту ў першамайскай дэманстрацыі. Рабочыя абавязаліся датэрмінова выканаць заказы для Крычаўскага цэмэнтнага заводу.

Гарсавет Асаавіяхіму праводзіць агульнагарадзкія спаборніцтвы на лепшага стралка. Спаборніцтвы зьяўляюцца адначасова і падрыхтоўкай да здачы норм на атрыманьне годнасьці варашылаўскага стралка.

Пабудова плодагароднага камбінату ў Менску

Пры плодагародзім трэсьце ў Менску пачынаецца пабудова новага камбінату па пераапрацоўцы плодагародніны, з прапускной здольнасьцю ў 3.100 тон павідла, цеста, вінігрэту, грыбоў, капусты, варэньня, тамату і г. д. і 15.000 гекталіграў фруктовых вод.

Прэзыдыум гарсавету прапанаваў трэсту фарсаваць будаўніцтва з такім разьлікам, каб асноўныя цэхі камбінату пусьціць у эксплёатацыю ў пачатку плодагароднага сэзону—да 1 ліпеня.

Усесаюзны конкурс прадпрыемстваў цяжкай прамысловасьці

1 мая пачынаецца ўсесаюзны конкурс прадпрыемстваў цяжкай прамысловасьці на лепшыя паказальнікі ў асваеньні тэхнікі. Конкурс арганізаваны НАРКАМЦЯЖПРАМАМ, УсеЦСПС, ЦК УсеЛКСМ і інш. арганізацыямі. Устанаўляецца рад прэмій: для прадпрыемстваў 2 першыя прэміі па 100 тыс. руб., 2 другія па 75.000 руб. і 2 трэція прэміі — па 50.000 руб. На індывідуальнае прэміраваньне асигнуецца 300.000 руб. За лепшую папулярызацыю конкурсу і лепшае асьвятленьне яго ходу будуць прэміраваны асобныя аўтары і газэты. Прысуджэньне прэмій будзе праведзена ў 16-ю гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі. Унутрызаводзкія конкурсы закончацца да 15 верасьня і паступяць на разгляд усесаюзнага журы да 1 кастрычніка.

Праверыць усхожасьць насеньня

Зараз, калі пачынаюцца масавыя палявыя работы, вялікае значэньне набывае выкананьне агрэмінімуму.

Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на пратручваньне і пракопчваньне насеньня.

Кожны калгас перад тым як высяваць насеньне павінен праверыць яго ўсхожасьць.

У кожным раёне ёсьць пункты па праверцы насеньня на ўсхожасьць. Кожны калгас, кожны адпаведнік перад пачаткам сэўбы павінны праверыць усхожасьць насеньня ў гэтых пунктах. Бо ў такім «пробізе», як праверка ўсхожасьці, адыгрывае значную ролю ў барацьбе за ўзьнімцце ўраджайнасьці.

А. Ор.

УМОВЫ ПРЫЁМУ

На аддзяленьне агітмасавых работнікаў 6-месячных курсаў райпартактыву пры ЦК КП(б)Б.

1. Аддзяленьне рыхтуе загадчыкаў агітмасавых аддзелаў РК КП(б)Б, райжаноргаў і агітмасаў буйных партколектываў.

2. На аддзяленьне агітмасавых работнікаў прымаюцца члены партыі па камандыроўках РК КП(б)Б, адпавядаючыя наступным умовам:

а) партстаж ня менш 4-х год (для райжаноргаў — ня менш 3-х год);

б) стаж партработы — ня менш 2-х год (для райжаноргаў — ня менш 1 году).

УВАГА: Па складу — рабочых ня менш 70 проц.

3. За курсантамі і іх сем'ямі захоўваецца пенсія і ўсе астатнія віды матар'яльнага забесьпячэньня па месцы іх папярэдняй работы.

4. Курсанты на курсах забясьпечваюцца харчаваньнем, інтэрнатам, пасьцельнымі прыладамі і вучэбнымі дапаможнікамі.

5. Заняткі пачнуцца 20 красавіка 1933 г. Да гэтага тэрміну ўсе залічаныя на курсы павінны зьявіцца ў горад Менск на курсы РПА. Прыём камандыровак і дакумантаў праводзіцца да 15-IV—1933 г. у канцылярыі курсаў — г. Менск, тэрыторыя 6. выстаўкі, курсы райпартактыву пры ЦК КП(б)Б.

6. Разам з камандыроўкай павінны быць дасланы наступныя дакументы: анкета, засьведчаная РК КП(б)Б, даведка аб стане здароўя, даведка аб атрымліваемай пенсіі і колькасьць упрыманцаў.

7. Прыём камандыровак і дакумантаў праводзіцца 15 красавіка г. г. у канцылярыі курсаў—г. Менск, курсы райпартактыву пры ЦК КП(б)Б. Пасьля скончэньня курсаў усе пакіроўваюцца па сваіх раёнах.

8. Разам з камандыроўкай 1 рэкамендацыйнай паперы быць дасланы наступныя дакументы: анкета, засьведчаная РК КП(б)Б, даведка аб стане здароўя, даведка аб атрымліваемай пенсіі і колькасьць упрыманцаў.

9. Устанавіць наступную разьвёрстку па раёнах: Менскі—12 чал., Бабруйскі—5 чал., Гомельскі—8 чал., Магілёўскі—6 чал., Аршанскі—5 чал., Віцебскі—10 чал., Полацкі—3 чал., Горацкі—3 чал., Мсьціслаўскі—3 чал., Шклоўскі—3 чал., Капыльскі—3 ч., Слуцкі—3 чал., Барысаўскі—4 чал., Клімавіцкі—3 чал., Рагачоўскі—3 чал., Жлобінскі—3 чал., Мазырскі—3 чал. і Рэчыцкі—3 чал.

Раёны: Лепельскі, Гарадоцкі, Лёзьнянскі, Талачынскі, Дуброўенскі, Чэрвуцкі, Бягомльскі, Плешчаніцкі, Дзяржынскі, Вузьдзенскі, Чырвона-Слабодзкі, Пухавіцкі, Асіпавіцкі, Быхаўскі, Крычаўскі, Касьцюковіцкі, Карманскі, Пятрыкоўскі, Ельскі, Нараўлянскі і Хойніцкі—па 2 чалавекі кожны, а ўсе астатнія раёны—па 1 чалавеку.

За сакратара ЦК КП(б)Б ЛЯЎКОЎ.
Сакратар ЦК ЛКСМБ КАМАРОЎ.
Заг. курсаў РПА пры ЦК КП(б)Б МАКОЎСКІ.

РАЗЬВЁРСТКА

Раёны	Агітмасаў	Жаноргі
1. Бабруйскі	3	2
2. Гомельскі	4	8
3. Віцебскі	6	2
4. Барысаўскі	1	2
5 Менскі	7	8
6. Аршанскі	2	2
7. Полацкі	1	1
8. Жлобінскі	2	1
9. Крычаўскі	1	1
10. Мазырскі	1	1
11. Рагачоўскі	1	1
12. Рэчыцкі	1	1
13. Слуцкі	1	—
14. Шклоўскі	1	1
15. Дзяржынскі	1	1
16. Лепельскі	1	—
17. Вузьдзенскі	1	—
18. Магілёўскі	2	2
19. Асіпавіцкі	1	1
Разам	35	25

Сакратар ЦК КП(б)Б РЫСКІН.
Нам. заг. агітмасавага аддзелу ЦК КП(б)Б ЛЕНЦНЭР.
Заг. курсаў РПА пры ЦК КП(б)Б МАКОЎСКІ.

Курсы райпартактыву пры ЦК КП(б)Б

Умовы прыёму на аддзяленьне сакратароў сельскіх РК ЛКСМБ і сакратароў камсамольскіх калектываў МТС і саўгасаў

1. Аддзяленьне рыхтуе сакратароў РК ЛКСМБ сельскіх раёнаў і сакратароў камсамольскіх калектываў у МТС і саўгасах.

2. Тэрмін навучаньня 6 месяцаў.

3. На аддзяленьне прымаюцца па рэкамендацыі РК ЛКСМБ сакратары і члены бюро камітэтаў і калектываў ЛКСМБ заводаў, фабрык, саўгасаў і МТС, са стажам кіруючай камсамольскай работы ня менш 6 месяцаў, члены партыі, якія маюць ня менш трохгадовага стажу знаходжаньня ў ЛКСМБ, маюць агульную адукацыю ў аб'ёме 6 груп сямігодкі і палітычную ў аб'ёме ВСПШ.

4. За курсантамі і іх сем'ямі захоўваецца пенсія і ўсе іншыя віды матар'яльнага забесьпячэньня па месцы іх папярэдняй работы.

5. Курсанты на курсах забясьпечваюцца харчаваньнем, інтэрнатам, пасьцельнымі прыладамі і вучэбнымі падручнікамі.

6. Заняткі пачнуцца 20 красавіка 1933 году. Да гэтага тэрміну ўсе залічаныя на курсы павінны зьявіцца ў г. Менск—курсы райпартактыву.

7. Прыём камандыровак і дакумантаў праводзіцца 15 красавіка г. г. у канцылярыі курсаў—г. Менск, курсы райпартактыву пры ЦК КП(б)Б. Пасьля скончэньня курсаў усе пакіроўваюцца па сваіх раёнах.

8. Разам з камандыроўкай 1 рэкамендацыйнай паперы быць пасланы наступныя дакументы: анкета, засьведчаная РК КП(б)Б, даведка аб стане здароўя, даведка аб атрымліваемай пенсіі і колькасьць упрыманцаў.

9. Устанавіць наступную разьвёрстку па раёнах: Менскі—12 чал., Бабруйскі—5 чал., Гомельскі—8 чал., Магілёўскі—6 чал., Аршанскі—5 чал., Віцебскі—10 чал., Полацкі—3 чал., Горацкі—3 чал., Мсьціслаўскі—3 чал., Шклоўскі—3 чал., Капыльскі—3 ч., Слуцкі—3 чал., Барысаўскі—4 чал., Клімавіцкі—3 чал., Рагачоўскі—3 чал., Жлобінскі—3 чал., Мазырскі—3 чал. і Рэчыцкі—3 чал.

Раёны: Лепельскі, Гарадоцкі, Лёзьнянскі, Талачынскі, Дуброўенскі, Чэрвуцкі, Бягомльскі, Плешчаніцкі, Дзяржынскі, Вузьдзенскі, Чырвона-Слабодзкі, Пухавіцкі, Асіпавіцкі, Быхаўскі, Крычаўскі, Касьцюковіцкі, Карманскі, Пятрыкоўскі, Ельскі, Нараўлянскі і Хойніцкі—па 2 чалавекі кожны, а ўсе астатнія раёны—па 1 чалавеку.

За сакратара ЦК КП(б)Б ЛЯЎКОЎ.
Сакратар ЦК ЛКСМБ КАМАРОЎ.
Заг. курсаў РПА пры ЦК КП(б)Б МАКОЎСКІ.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

АНОНС! ПРЭМ'ЕРА!
Кіно „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“.
НОВЫ ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ ВЫТВОРЧАСЬЦІ БЕЛДЗЯРЖКІНО
СЛАВА СЬВЕТУ
Папярэдні продаж білетаў 15-га красавіка з 1 гадз. дня.

Чыр. Зорка — Каса — ад 1 г. дня. Новая сьвецкая мастацкая камедыя Шукаю пратэкцыю
Дзіцячы гукавы Кіно-тэатр — Каса з 12 г. дня. З 1 красавіка новы мастацкі фільм РАЗАМ з БАЦЬКАМІ
„Інтэрнацыянал“ — Каса — з 2 г. дня. ЗАКОН І АБАВЯЗАК (АМСК) драма ў 6 ч.
Кіно „ПРАЛЕТАРЫ“ Замежная камедыя ВОРАГ ЖАНЧЫН
„СПАРТАК“ — КАСА — з 2 г. 30 м. Мастацкі фільм Барацьба гігантаў драма ў 10 частках.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“.
Ад 14 красавіка, замежны фільм
КАПІТАН ЛЯТУЧАЙ ЧАРАПАХІ.
У ГАЛ. РОЛІ: ФІЛІС ХЭВЭР.
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ кіно-хро кіна САЮЗКІНО.
КАСА адкрыта ад 4 гадз. дня.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ на 4-месячныя падрыхтоўчыя КУРСЫ Ў ПЛЯНАВА-ЭКАНАМІЧНЫ ІНСТЫТУТ (ФАКУЛЬТЭТ НАРГАСВУЧОТУ) працягнут да 25 красавіка.
Стыпэндыя ад 30 да 60 руб. ў м-ц і кватэрныя 20 руб. у месяц.
Заявы прымаюцца ў канцылярыі ВОСТ (Менск, Камуністычная, 16, пакой № 10).

СЭКТАР КАДРАЎ НКФ БССР абвяшчае НАБОР на 9-месячныя фінансавыя КУРСЫ
па падрыхтоўцы загадчыкаў райфа і інспэктараў фінансавых аддзелаў па бюджэту, дзяржстрахаваньню і дзяржаходах.
Курсанты забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй ад 70 да 150 руб.
Да заявы павінны быць прыкладзены наступныя дакументы: даведка аб адукацыі, копія працоўнага сьпісу, а для калгаснікаў—даведка ад калгасу, камандыроўка гарфа ці райфа, копія вайсковага дакумэнту.
Заявы з дакумантамі пасылаць да 25-га красавіка—
Менск, Савецкая, 45, Наркамфін.

Усім гар. і райКК-РСІ і камунальным аддзелам.

Ход падрыхтоўкі і разгортваньня будаўніцтва ў бягучым годзе паказвае, што большасьць камунальных аддзелаў, будаўнічых і будуючых арганізацый ня ўлічылі ўрокаў мінулага году, калі з-за несвоечасовага забесьпячэньня пабудоў праектамі і чарцяжамі, незабесьпячэньня рабочай сілай, распыленасьці сродкаў і матар'ялаў па некаторых аб'ектах, плян будаўніцтва па многіх гарадох аказаўся нявыкананым.

Гэтым недахопы паўтараюцца і ёлета, а мясцовыя арганізацыі ня прымаюць належных мер да разгортваньня будаўніцтва.

Выходзячы з гэтага, ЦКК-НК РСІ і НККГ прапануюць:

1. З 17 па 22 красавіка правесьці масавую праверку падрыхтаванасьці будаўнічых і будуючых арганізацый да разгортваньня будаўніцтва па кожнаму аб'екту пасобку, у гэту праверку максымальна ўцягнуць сакцыі РСІ, камунальныя сэкцыі гарсавету і інжынэрна-тэхнічных работнікаў.

2. Абавязаць будаўнічыя і будуючыя арганізацыі не пазьней 20 красавіка скончыць заключэньне дагавораў і не пазьней 1 мая забесьпечыць усе прадугледжаныя плянамі аб'екты капітальнымі праектамі і вытворчымі капітарысамі.

3. Пад адказнасьць кіраўнікоў будаўнічых і будуючых арганізацый неадкладна прыняць меры да поўнай рэалізацыі нарадаў на будматар'ялы, завозу іх на будаўнічыя пляцоўкі, канцэнтруючы матар'ялы на тых аб'ектах, якіх процант тэхнічнай гатоўнасьці дазволіць у бліжэйшы час скончыць і здаць у эксплёатацыю.

Гар. і райКК РСІ і камунальныя аддзелы па скончэньні праверкі падводзяць вынікі і матар'ялы з вывадамі і прапановамі прадстаўляюць у ЦКК-НК РСІ не пазьней 28 красавіка.

Старшыня ЦКК- НК РСІ ЛЫЧОЎ.
Народны камісар камунальнай гаспадаркі БССР ЖУКОВІЧ.

Аб выбарах акадэмікаў Беларускай Акадэміі Навук
Прэзыдыум Беларускай Акадэміі Навук паведамляе, што 22-га МАЯ 1933 г. склікаецца
сэсія акадэміі,
на якой будуць зроблены выбары новых акадэмікаў:
1. Абвяшчаюцца выбары 7-мі акадэмікаў у галіне грамадаведчых, прыродазнаўчых і тэхнічных навук.
2. У акадэмікі Беларускай Акадэміі Навук выбіраюцца прадстаўнікі навукі, тэхнікі або мастацтва, якія ўзбагацілі навуку, тэхніку або мастацтва працамі, асабліва выдатнага значэньня, якія накіроўваюць сваю дзейнасьць на карысьць сацыялістычнага будаўніцтва.
3. Кандыдаты ў акадэмікі Беларускай Акадэміі Навук галучаюцца навуковымі, устаноўчымі, вышэйшымі школамі, грамадзкімі арганізацыямі, пасобнымі вучонымі і групамі іх.
4. Установы, арганізацыі і асобы, якія высоўваюць кандыдатаў у акадэмікі, прадстаўляюць у Беларускую Акадэмію Навук наступнае: а) жыцьцёпіе высунутага кандыдата, б) яго характарыстыку, в) навуковыя працы.
5. Апошнім тэрмінам прадстаўленьня кандыдатаў устанаўляецца 5-га МАЯ 1933 г.
6. Сьпіс высунутых кандыдатаў публікуецца ў друку для шырокага грамадзкага абмеркаваньня.
Прэзыдэнт Беларускай Акадэміі Навук П. ГОРЫН.
Неадменны сакратар ПАНКЕВІЧ.

Навуковыя работнікі і студэнцтва фізыка-матэматычнага факультэту Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту з глыбокім жалем паведамляюць аб сьмерці свайго прафэсара матэматыкі,
Якуба Пінкусовіча ГРОМЭРА

Камісія па арганізацыі пахаваньня прафэсара
Якуба Пінкусовіча ГРОМЭРА.
паведамляе, што вынас цела Я. П. Громэра адбудзецца 14 красавіка ў 2 г. дня з памяшканьня Беларускай Акадэміі Навук.

Кат